www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 4 чэрвеня 2007 года, № 10–11 (1961–1962)

УРАЧЫСТАСЦІ

## УНІВЕРСІТЭЦКІ ЗЛЁТ У ВЯЗЫНЦЫ

***У суботу, 19 мая, студэнтаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта прымала купалаўская зямля. Менавіта тут, у Вязынцы, (Маладзечанскі раён) адбыўся студэнцкі злёт "Вязынка–2007". Гэтая патрыятычна-асветніцкая акцыя была прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.***



*Гучалі музыка і слова: бардаўскі канцэрт*

З 1976 г. гэта мерапрыемства ладзілася выключна філфакам. Цяпер з нагоды юбілею ды і дзеля таго, каб аднавіць слаўныя традыцыі, яно набыло агульнауніверсітэцкі маштаб. Вялікую дапамогу сталым арганізатарам здзейсніла Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю.

Умоўна праграма святкавання была падзелена на тры часткі. Пасля выступленняў дырэктара Дзяржаўнага музея Янкі Купалы А. Мацевасян, начальніка аддзела культуры Маладзечанскага райвыканкама А. Рамановіча, рэктара БДУ В. Стражава, дэкана філфака І. Роўды і старшыні Міжнароднага фонда Янкі Купалы В. Рагойшы адбыўся канцэрт, на якім студэнты і выкладчыкі



*Сапраўдны культурны адпачынак*



*Хто дужэйшы: каманда рэктара на перацягванні каната*

БДУ выконвалі творы вялікіх песняроў. Прычым гучалі яны на розных мовах свету. Усе ўдзельнікі прадэманстравалі не толькі цудоўныя прамоўніцкія, але і вакальныя, танцавальныя, акцёрскія здольнасці. Пасля былі ўскладзены кветкі да помніка.

Другая частка акцыі – спартыўна-забаўляльная – адбывалася на маляўнічым узгорку, які "ў народзе" называецца "Парнасам". Тут прайшлі спартыўныя спаборніцтвы. Шмат жадаючых знайшлося, каб забіць гол у вароты, якія спачатку абараняў рэктар БДУ, затым – дэкан філфака; а потым паспрабаваць уласныя сілы ў перацягванні каната, кручэнні хула-хупаў і пляжным валейболе. Пасля такой фізічнай нагрузкі трэба было як след падсілкавацца. Даспадобы прыйшлася "Каша ад рэктара", якой Васіль Іванавіч частаваў усіх прысутных.

Ну а трэцяя частка святочнага дня атрымалася, напэўна, самай нефармальнай, бо яе распачаў бардаўскі канцэрт, які павольна перайшоў у "Свабодны мікрафон", дзе ўсе ўдзельнікі ва ўсёй красе маглі праявіць свае таленты.

Жарты, песні ды скокі ў добрай кампаніі на свежым паветры. Чым не найлепшы адпачынак? Чым не выдатныя выходныя? Беларускі дзяржаўны універсітэт у чарговы раз паказаў, як можна карысна і весела правесці вольны час. Хочацца, каб гэтая ўдалая акцыя мела працяг, і наступнай вясной мы зноў усім Універсітэтам святкавалі чарговую дату з дня нараджэння беларускіх класікаў.

**Сяргей ЧАРНЯЎСКІ,**
**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

ВІНШУЕМ!

## НА ДОШКУ ГОНАРУ

***Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем БДУ занесены на Рэспубліканскую дошку гонару.***

Такую ўзнагароду НДІ ФХП атрымаў за другое месца ў спаборніцтвах за найлепшыя вынікі ў 2006 г. у дасягненні асноўных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця сярод арганізацый навукі і навуковага абслугоўвання. Загад аб гэтым падпісаў Прэзідэнт нашай краіны 30 красавіка.

Дарэчы, НДІ ФХП не ўпершыню ганараваны такім чынам. За значныя дасягненні ў мінулай пяцігодцы (2001–2005) інстытут летась быў увогуле прызнаны пераможцай у сваёй намінацыі!

## КУБАК ЗА УНІВЕРСІЯДУ

***Каманда БДУ заняла II месца ў сваёй групе на Рэспубліканскай універсіядзе 2007 г.***

Нашы студэнты спаборнічалі з равеснікамі з БДЭУ, БНТУ, БДУІР, БДТУ і Гора-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі па 30-ці відах спорту і сталі пераможцамі ў грэка-рымскай барацьбе, гіравым спорце, лёгкай атлетыцы, легкаатлетычным кросе, лыжах, веласпорце і плаванні. Для ўдзелу ва універсіядзе свае каманды заявілі болей за 50 ВНУ рэспублікі. Узнагароджванне пераможцаў адбылося 19 мая ў лёгкаатлетычным манежы, што па вул. Каліноўскага.

На ўрачыстай цырымоніі прысутнічалі міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў, міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгор'еў, прарэктар па вучэбнавыхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ Уладзімір Сувораў, кіраўнікі іншых ВНУ краіны і заслужаныя дзеячы фізічнай культуры і спорту Беларусі.

21 мая на пасяджэнні Вучонага савета загадчык кафедры фізвыхавання і спорту Віктар Каляда ўручыў рэктару Белдзяржуніверсітэта прафесару Васілю Стражаву падзяку міністра адукацыі, а таксама перадаў кубак і грамату за II месца БДУ ў згаданых спаборніцтвах.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## СТАСУНКІ З БАЛТЫЯЙ

***Дэлегацыя Савета дзяржаў Балтыйскага мора (СДБМ) на чале з дырэктарам Сакратарыята Габрыеляй Кётшау наведала БДУ 24 мая падчас працоўнага візіту ў Рэспубліку Беларусь.***

На сустрэчы з прарэктарамі БДУ Уладзімірам Паньковым і Віктарам Самахвалам абмяркоўваліся магчымасці супрацоўніцтва Беларусі з краінамі Балтыі, а таксама ажыццяўлення сумесных адукацыйных праектаў з прыцягненнем фінансавых сродкаў Еўрасаюза. Як найбольш перспектыўныя напрамкі разглядаліся экалогія, навуковыя распрацоўкі, а таксама ўзаемадзеянне ў выкладанні асобных дысцыплін. Так, замежныя госці распавялі аб існаванні ў многіх балтыйскіх вышэйшых навучальных установах так званых еўрафакультэтаў (пераважна па эканамічных ці юрыдычных спецыяльнасцях), якія функцыянуюць па адпаведных адукацыйных стандартах.

Гэты першы кантакт БДУ з дадзенай уплывовай арганізацыяй сведчыць аб канкрэтным інтарэсе да вядучай айчыннай ВНУ.

**Дзмітрый ГОРСКІ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**



*Габрыеля Кётшау на перамовах з БДУ*

### Даведка

Савет дзяржаў Балтыйскага мора – міжурадавая арганізацыя, заснаваная на Канфёрэнцыі міністраў замежных спраў краін Балтыйскага мора ў Капенгагене 5–6 сакавіка 1992 г. У яе склад уваходзяць Германія, Данія, Латвія, Літва, Нарвегія, Польшча, Расія, Фінляндыя, Швецыя, Эстонія, а таксама Еўрапейская камісія – выканаўчы орган Еўрапейскага саюза.

### СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ЮРЫДЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ МАЕ АСАБЛІВАЕ ЗНАЧЭННЕ**
З даклада дэкана юрыдычнага факультэта Сяргея Балашэнкі аб выкананні праграм перспектыўнага развіцця
Стар. 2–3

**СТУДЭНЦКІЯ АТРАДЫ: СУЧАСНАЯ МОЛАДЗЬ ЗА СТАРЫЯ ТРАДЫЦЫІ**
Стар. 4

**ЭКАЛОГІЯ ПА ШВЕДСКІМ УЗОРЫ**
Пра ўдзел студэнтаў БДУ ў праграме "Балтыйскі універсітэт"
Стар. 8

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ на чале з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым з 24 па 31 мая наведала Ізраіль, дзе правяла перамовы аб супрацоўніцтве з вядучымі ВНУ гэтай краіны ў Тэль-Авіве, Іерусаліме і Хайфе, а таксама некаторымі дзяржаўнымі ўстановамі. Акрамя гэтага, В.Стражаў даў інтэрв'ю журналістам Першага радыё і газеты "Навіны тыдня", а таксама правёў канферэнцыю ў рэжыме on-line. Візіт ажыццяўляўся пры падтрымцы пасольства Беларусі ў Ізраілі.

ПЕРАМОВЫ БДУ з Інжынерным інстытутам Міністэрства народнай улады па навуцы і тэхналогіях Венесуэлы аб падрыхтоўцы венесуэльскіх спецыялістаў і выкананні сумесных навуковых праектаў адбыліся 29 мая падчас візіту дэлегацыі гэтай краіны. З гасцямі сустрэўся прарэктар па навуцы Уладзімір Панькоў.

РЭКТАР Далянскага універсітэта Оу Цзінпін у складзе кітайскай дэлегацыі наведаў 1 мая Белдзяржуніверсітэт, дзе падпісаў пагадненне з кіраўніцтвам БДУ, якое прадугледжвае навучанне кітайскіх студэнтаў, арганізацыю стажыровак, а таксама шырокае ўзаемадзеянне ў сферы культуры і міжнароднага турызму.

УШАНАВАННЕ студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ – дыпламантаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ 2006 года прайшло 23 мая. Дыпломы і прэміі атрымалі 27 аўтараў работ 1-й катэгорыі. Цырымонія адбылася ў рамках 64-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Белдзяржуніверсітэта.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ЮРЫДЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ

## Са справаздачы дэкана юрыдычнага факультэта Сяргея БАЛАШЭНКІ аб выкананні

Праграмы перспектыўнага развіцця БДУ выконваюцца на працягу амаль трох гадоў, і ўжо можна гаварыць пра некаторыя вынікі работы юрыдычнага факультэта па ўдасканаленні прававой адукацыі і навукі.

Юрыдычнай адукацыі, а значыць, і юрыдычнаму забеспячэнню жыцця краіны ў нашай дзяржаве надаецца асаблівае значэнне. Нашы выпускнікі працуюць у Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, судовых установах усіх узроўняў, сістэме органаў Пракуратуры, Міністэрства юстыцыі, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства замежных спраў, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях. У апошнія гады прыняты шэраг актаў заканадаўства розных узроўняў (уключаючы Канцэпцыю юрыдычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь), накіраваных на паляпшэнне падрыхтоўкі юрыдычных кадраў – высокапрафесійных спецыялістаў, адказных грамадзян і патрыётаў. Каб падрыхтаваць такога спецыяліста, трэба зрабіць студэнта актыўным удзельнікам адукацыйнага працэсу, далучыць яго, побач з вучэбнымі заняткамі, да навукова-даследчай работы, культурна-масавай, спартыўнай і творчай дзейнасці. Гэта магчыма толькі пры пабудове адносін паміж студэнтам і выкладчыкам на аснове партнёрства і супрацоўніцтва.

Дыяграма 1.




Ёсць шэраг *асноўных складнікаў*, якія характарызуюць вышэйшую адукацыйную школу, і праграмы развіцця БДУ цалкам скіраваныя на іх удасканаленне:

- кадры;
- якасны склад студэнтаў;
- вучэбна-метадычная работа;
- выхаваўчая і ідэалагічная работа;
- арганізацыйная структура;
- матэрыяльна-тэхнічная база;
- выпускнікі.

**Кадравае пытанне** для факультэта балючае. Менш чым за год з факультэта звольніліся сем кандыдатаў юрыдычных навук, дацэнтаў. Канешне, мы рады, што іх запрашаюць, як правіла, на высокія дзяржаўныя пасады, вырашаючы такім чынам кадравае пытанне дзяржавы. На юрыдычным факультэце 10 кафедраў, на якіх працуюць 184 выкладчыкі (з іх: штатных – 131, знешніх сумяшчальнікаў – 53). З ліку штатных выкладчыкаў: дактароў навук – 15, кандыдатаў навук – 79, без ступені – 37. З ліку сумяшчальнікаў: дактароў навук – 3, кандыдатаў навук – 31, без ступені – 19. Прафесарска-выкладчыцкі састаў кафедраў факультэта, а таксама іншых падраздзяленняў, якія ўдзельнічаюць у выкананні вучэбнага плана на юрыдычным факультэце, забяспечвае выкладанне вучэбных дысцыплін на высокім узроўні.

Колькасць вучэбна-дапаможнага персаналу факультэта – 56 чалавек. Павышэнню якасці навучання спрыяюць 5 вучэбных лабараторый – заканадаўства, інфарматыкі і ТСН, крыміналістыкі, палітычных тэхналогій, "Юрыдычная клініка" і 3 вучэбныя кабінеты – тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, прававой інфарматыкі.

З кадравым пытаннем звязана пытанне, якое з разраду асабістых праблем суіскальнікаў навуковай ступені перарасло ў факультэцкую і універсітэцкую праблему – гэта падрыхтоўка і абарона доктарскіх дысертацый.

На факультэце штогадовы набор у аспірантуру складае 25–30 чалавек. У апошнія гады значна пашырылася мэтавая падрыхтоўка аспірантаў. Кожны год своечасова абараняецца 10–25 % аспірантаў. Астатнія, як правіла, абараняюцца праз 1–2 гады, працуючы выкладчыкамі факультэта. У 2006–2007 навучальным годзе супрацоўнікамі і аспірантамі факультэта (у тым ліку аспірантамі мінулых гадоў) абароненыя 10 кандыдацкіх дысертацый. Уведзена практыка штогадовага заслухоўвання справаздач кожнага аспіранта на Вучоным савеце факультэта (пасля іх атэстацыі на кафедрах). Падрабязна высвятляецца стан дысертацыі, прымаецца рашэнне аб мэтазгоднасці працягу навучання ў аспірантуры асоб, што не выканалі ўсе заданні індывідуальнага плана. Гэтыя заходы сталіся вельмі эфектыўнымі. Намагаемся актыўна далучыць аспірантаў да вучэбнага працэсу шляхам абавязковай падрыхтоўкі курса лекцый у схемах.

На факультэце пастаянна ладзяцца 4 навукова-метадалагічныя семінары, якія выконваюць адпаведныя функцыі і з'яўляюцца найважнейшым звяном удасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Зараз па ініцыятыве Пракуратуры Рэспублікі Беларусь вывучаецца пытанне аб адкрыцці на базе БДУ прафесійнай магістратуры па падрыхтоўцы спецыялістаў для працы ў сістэме органаў пракуратуры краіны.

Рэалізуючы ***праграму развіцця сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі педагагічных і навуковых кадраў***, юрыдычны факультэт кожны год зацвярджае планы павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу, што выконваюцца няўхільна. Многія выкладчыкі факультэта штогод удзельнічаюць у міжнародных канферэнцыях, "круглых сталах", семінарах.

Адмоўны момант кадравага забеспячэння вучэбнага працэсу – загадчыкі 5-ці кафедраў працуюць на грамадскіх пачатках (хаця тое, што яны займаюць высокія дзяржаўныя пасады, спрыяе ўзаемадзеянню вучэбнай і навуковай работы кафедраў з практычнай дзейнасцю). Не павялічваецца колькасць дактароў навук.

На трох спецыяльнасцях па дзевяці спецыялізацыях юрыдычнага факультэта вучыцца болей за 2,5 тыс. студэнтаў (з іх болей за 1000 – на завочнай форме навучання), 23 магістранты, 104 аспіранты і суіскальнікі вучонай ступені.

У апошнія гады мы назіраем тэндэнцыю зніжэння студэнцкай паспяховасці. Калі ў 1998 г. яна складала 95 %, то сёння ў "бюджэтнікаў" – 90 %, а ў "платнікаў" – 66 %. Зніжэнне працэнта паспяховасці тлумачыцца як павышэннем патрабавальнасці выкладчыкаў, так і павелічэннем колькасці студэнтаў-"платнікаў", якія не намагаюцца добра вучыцца.

*Вынікі размеркавання выпускнікоў* юрыдычнага факультэта за апошнія гады паказваюць запатрабаванасць нашых выпускнікоў.

З канца 80-х гг. юрыдычны факультэт вядзе **платную падрыхтоўку** спецыялістаў. Колькасць іх з кожным годам узрастае. У 2004–2005 навучальным годзе іх было 507, у 2006–2007 – 1219. ***Праграму развіцця платных адукацыйных паслуг*** мы выконваем цалкам, аднак лічым, што ўсталяваная плата за навучанне (асабліва на завочным аддзяленні пры атрыманні другой вышэйшай адукацыі) беспадстаўна заніжана.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу на юрыдычным факультэце пабудаваная на належным забеспячэнні вучэбна-метадычнымі матэрыяламі для павелічэння ўдзельнай вагі ***самастойнай і кантралюемай работы студэнтаў***. Па ўсіх дысцыплінах кафедры распрацавалі тэставыя заданні; усе курсы забяспечаны вучэбнымі праграмамі, вучэбнымі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, ВМК, у тым ліку і ў электронным выглядзе. Працягваецца ўкараненне навацый у навучальны працэс. Практыкуецца чытанне праблемных лекцый, правядзенне дзелавых гульняў і "майстар-класаў", семінарскіх заняткаў метадам малых груп, пасяджэнняў "круглых сталоў" па тэмах лекцыйнага курса; на лекцыях, практычных і лабараторных занятках выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі навучання (камп'ютары, праектары, фота-, відэа- і аўдыёапаратура; складаная крыміналістычная тэхніка), раздатачны матэрыял. На факультэце ўкаранёныя такія формы КСР, як пісьмовая здача залікаў і экзаменаў; выкананне рэфератаў; бягучы (прамежкавы) кантроль ведаў; падрыхтоўка пытанняў для самакантролю; адпрацоўка заданняў, якія былі прапушчаны ці выкананы нездавальняюча; прадстаўленне пісьмовых работ студэнтамі завочнай формы навучання па электроннай пошце; правядзенне калёквіумаў; студэнтам даюцца заданні па рашэнні казусаў.

Асабліва адзначым работу вучэбна-метадычнай камісіі факультэта, якую ўзначальвае прафесар кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду В.М. Бібіла. Камісія праводзіць метадычныя семінары, "круглыя сталы", дыскусіі для выкладчыкаў і аспірантаў; ажыццяўляе кантроль за станам вучэбна-метадычнай дакументацыі, неабходнай для вучэбнага працэсу; распрацоўвае і выдае рэкамендацыі па афармленні работ студэнтаў (курсавой, выпускной бакалаўрскай, дыпломнай работы, магістэрскай дысертацыі), вучэбна-метадычныя рэкамендацыі з улікам новых ДАСТаў па бібліяграфічным апісанні крыніц; ладзіць сацыялагічныя даследаванні і анкетаванне студэнтаў па рознай тэматыцы вучэбнага працэсу; удзельнічае ў распрацоўцы новых стандартаў і вучэбных планаў, рэцэнзуе вучэбныя планы юрыдычных навучальных устаноў краіны.

Пры лабараторыі інфарматыкі і ТСН створана выдавецкая група, якая ажыццяўляе сканіраванне, камп'ютарны набор і вёрстку падручнікаў, практыкумаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, матэрыялаў навуковых канферэнцый, што адбываюцца на факультэце (іх тыражаванне), збор артыкулаў, вёрстку і распрацоўку арыгінала-макета вядомага зборніка "Права і дэмакратыя", які выдае факультэт. Выданне малатыражнай вучэбна-метадычнай літаратуры праводзіцца на ўласным абсталяванні.

Слайд 1. **ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ**




Актыўна вядзецца праца па падрыхтоўцы і выданні Беларускай юрыдычнай энцыклапедыі, каментарыяў да кодэксаў.

Аб'яднанне ўсіх камп'ютараў факультэта лакальнай сеткай дазволіла звяртацца да рэсурсаў электронных баз даных нарматыўна-прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь ("ЭТАЛОН" і "КАНСУЛЬТАНТ") і да электроннай базы даных нарматыўна-прававой інфармацыі Расійскай Федэрацыі з любога факультэцкага камп'ютара. Абнаўленне электронных баз даных выконваецца супрацоўнікамі штотыдзень.

На вучэбным сайце юрыдычнага факультэта размешчаны вучэбныя і вучэбна-метадычны матэрыялы па ўсіх курсах і спецкурсах, так што студэнты могуць рыхтавацца да заняткаў, залікаў і экзаменаў не толькі на факультэцкіх, але і на хатніх камп'ютарах. Афіцыйны сайт юрыдычнага факультэта ў 2007 г. атрымаў Інтэрнэт-прэмію XIV Міжнароднай спецыялізаванай выставы "ТИБО–2007".

Выкладчыкі факультэта імкнуцца ўкараніць у навучальны працэс перадавыя тэхналогіі. Для правядзення заняткаў мы набылі і шырока выкарыстоўваем мультымедыйнае абсталяванне.

***Навукова-даследчая работа*** на факультэце ажыццяўляецца выкладчыкамі кафедраў, аспірантамі, суіскальнікамі вучонай ступені і студэнтамі факультэта. У навуковых даследаваннях удзельнічаюць 10 кафедраў. На факультэце выконваецца 9 навуковых тэм, у тым ліку 3 тэмы Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Эканоміка і грамадства" (2006–2010 гг.).

Штогод праводзяцца міжнародныя навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, матэрыялы якіх публікуюцца ў зборніках. У 2006 г. праведзена 8 навуковых канферэнцый і "круглых сталоў", у 2007 г. – 3 навуковыя канферэнцыі і семінары.

Вынікі навуковых даследаванняў выкарыстаны Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, у нарматыўных прававых актах, якія распрацоўвае Нацыянальны цэнтр заканапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, у пастановах Пленуму Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Найвышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь па асобных пытаннях правапрымяняльнай практыкі, у тлумачэннях і метадычных указаннях Міністэрства юстыцыі, Пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

Юрыдычны факультэт займае асаблівае месца ў прававой структуры нашай дзяржавы. Мы праводзім велізарную работу па падрыхтоўцы і экспертызе нарматыўных прававых актаў. Штогод адбываецца экспертыза амаль 50 законапраектаў.

Асобныя выкладчыкі факультэта з'яўляюцца членамі Навукова-кансультатыўных саветаў Вярхоўнага Суда, Найвышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь, Міністэрства юстыцыі, Пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

Юрыдычны факультэт робіць значны ўнёсак у выкананне ***праграмы "Выдавецкая дзейнасць"***. У 2006 годзе юрыдычны факультэт

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# МАЕ АСАБЛІВАЕ ЗНАЧЭННЕ

## праграм перспектыўнага развіцця на пасяджэнні Вучонага савета БДУ 21 мая

апублікаваў 737 навуковых работ, з іх: 12 манаграфій, 5 падручнікаў, 37 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў (7 – афіцыйна зацверджаных). У апошнія гады праводзіцца вельмі эфектыўная работа па падрыхтоўцы і выданні вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры сумесна з ДзІКСТам БДУ. Юрфак з'яўляўся і застаецца донарам вучэбных, вучэбна-метадычных і навуковых выданняў для навучальных і навуковых устаноў, практычных органаў усёй рэспублікі. Аднак запланаванае з 2007–2008 навучальнага года ўсталяванне вучэбнай нагрузкі на 1-го выкладчыка ў колькасці 800 гадзін можа адмоўна адбіцца на якасці падрыхтоўкі вучэбных і вучэбна-метадычных распрацовак.

Юрыдычны факультэт БДУ плённа ***супрацоўнічае*** з Інстытутам дзяржавы і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (выконваюцца сумесныя навуковыя тэмы), з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам па шырокім коле пытанняў супрацоўніцтва ў адпаведнасці з заключанымі БДУ дамовамі (у прыватнасці, сумесныя навуковыя праграмы, узаемны ўдзел у Спецыялізаваных саветах па абароне дысертацый і інш.). Штогод вядучыя навукоўцы іншых ВНУ, НАН Беларусі, кіраўнікі праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь прыцягваюцца да працы на факультэце ў якасці старшынь ДзЭКаў, навуковых кіраўнікоў дыпломных праектаў. У апошнія гады мы ажыццяўляем мэтавую падрыхтоўку педагагічных кадраў найвышэйшай кваліфікацыі юрыдычных спецыяльнасцяў праз аспірантуру практычна для ўсіх універсітэтаў краіны.

Юрыдычны факультэт шырока развівае ***міжнароднае супрацоўніцтва*** з замежнымі навуковымі і навучальнымі ўстановамі: роднаснымі факультэтамі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта, Вільнюскага універсітэта, Люблінскага і Вроцлаўскага універсітэтаў (Польшча), Маскоўскай акадэміяй права, Уральскай юрыдычнай акадэміяй (РФ), Харкаўскай юрыдычнай акадэміяй (Украіна), факультэтам права Літоўскага юрыдычнага універсітэта і юрыдычным факультэтам Львоўскага нацыянальнага універсітэта імя І. Франко. Шэраг выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў нашага факультэта праходзілі стажыроўку ва універсітэтах і іншых навучальных установах замежных краін (Аўстрыі, Германіі, Венгрыі, Іспаніі, Францыі), бралі ўдзел у міжнародных праектах і канферэнцыях. Дзейнічае шэраг двухбаковых дамоўленасцяў. Студэнты і выкладчыкі пазначаных універсітэтаў і юрыдычнага факультэта БДУ ўдзельнічаюць у Міжнародных навуковых канферэнцыях, што ладзіць юрфак БДУ і гэтыя універсітэты; абмяркоўваюцца сумесныя напрамкі дзейнасці; рыхтуюцца водгукі на аўтарэфераты дысертацый; вядучыя навукоўцы універсітэтаў выступаюць у якасці апанентаў па абароне дысертацый і інш.

***Навукова-даследчая работа студэнтаў*** адбываецца па тэматыцы НДР кафедраў праз удзел студэнтаў у навуковых канферэнцыях, студэнцкіх алімпіядах, конкурсах студэнцкіх навуковых работ, працы студэнцкіх навуковых гурткоў, спецсемінараў кафедраў па выніках напісання студэнтамі курсавых работ (іх публічная абарона і абмеркаванне), калектыўных даследаваннях па студэнцкіх грантах, навукова-практычных канферэнцыях па выніках вытворчай практыкі студэнтаў, спецыфічных студэнцкіх мерапрыемствах з элементамі навукова-пазнавальнай дзейнасці.

*Дыяграма 2.*

**Звесткі аб студэнтах, якія навучаюцца за грошы (2000–2007 гг.)**




На юрыдычным факультэце штогод фарміруецца галіновы банк даных аб дыпломных праектах і навуковых студэнцкіх работах. У 2006 г. рашэннем ДзЭКа 6 дыпломных работ былі рэкамендаваныя ў якасці вучэбных дапаможнікаў для выкарыстання на кафедрах факультэта, а 9 работ прапанаваныя Нацыянальнаму цэнтру законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь для ўкаранення ў дзеючае заканадаўства.

На працягу апошніх чатырох гадоў юрыдычны факультэт удзельнічае ў Беларускіх студэнцкіх юрыдычных алімпіядах (апошнія дзве адбыліся на базе факультэта). Каманды юрфака і студэнты ў індывідуальных турах заўсёды займалі I–II месцы.

Новай тэхналогіяй навучання практычным навыкам з'яўляецца лабараторыя "Юрыдычная клініка", праект якой ажыццяўляецца пры падтрымцы Праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь і Прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў у Рэспубліцы Беларусь. Мэты гэтага праекта: удасканаленне працэсу навучання студэнтаў, прышчапленне ім навыкаў работы па аказанні юрыдычных паслуг, афармленні прававых дакументаў, вывучэнні і засваенні норм юрыдычнай этыкі. Студэнты, якія працуюць у "Клініцы", тлумачаць грамадзянам існуючае заканадаўства, дапамагаюць ім складаць дакументы юрыдычнага характару, кансультуюць па пытаннях, што датычаць абароны інтарэсаў грамадзян у дзяржаўных органах, а таксама аказваюць іншую інфармацыйна-прававую дапамогу. Штогод юрыдычную дапамогу атрымліваюць больш за 500 чалавек – незаможных грамадзян, якія здолелі вырашыць свае праблемы, дзякуючы дапамозе студэнтаў. "Клініка" зарэкамендавала сябе як паспяховая арганізацыя, што мае высокі рэйтынг сярод аналагічных устаноў Расіі, Украіны, Казахстана, Польшчы і іншых краін.

З 2005 года юрыдычны факультэт мае добрую ***матэрыяльна-тэхнічную базу***, якая дазваляе выйсці на новы ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў. Усе кафедры і вучэбныя лабараторыі аснашчаны новым камп'ютарным абсталяваннем, маюцца дзве чытальныя залы ў бібліятэцы, тры камп'ютарныя класы. Фонд бібліятэкі няспынна папаўняецца як за кошт набыцця новай літаратуры, так і ў значнай ступені за кошт дарыльшчыкаў (былых і цяперашніх студэнтаў юрфака). У бібліятэцы створана і вядзецца Ганаровая кніга дарыльшчыкаў.

Бібліятэка – сэрца кожнай навучальнай установы. На 1 студзеня 2007 г. фонд аддзела забеспячэння юрыдычнай літаратурай Фундаментальнай бібліятэкі БДУ складае 159 922 асобнікаў кніг, брашур і перыядычных выданняў. Сярэдняя колькасць кніг, выдадзеных аднаму чытачу за год (чытэльнасць) – 70, сярэдняе дзённае наведванне бібліятэкі – 339 чалавек.

На факультэце заведзена традыцыя: кожны выпускнік можа падарыць кнігу, манаграфію бібліятэцы факультэта. Я разглядаю гэтую акцыю як элемент уваходжання ў гісторыю факультэта. На падараваны асобнік ставіцца штамп "Падаравана бібліятэцы юрыдычнага факультэта".

*Слайд 2.*

**БЕЛАРУСКАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЮРЫДЫЧНАЯ АЛІМПІЯДА–2007**



**У камандным заліку:**

1 месца – каманда БДУ (каманда №1)

2 месца – каманда БДУ (каманда №2)

3 месца – каманда БДЭУ

**У індывідуальным заліку:**



1 месца – Позднева Т. *(5 к.; Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце РБ)*

2 месца – Аўдзееў Д. *(2 к.; юрыдычны факультэт БДУ)*

3 месца – Галубенка І. *(2 к.; юрыдычны факультэт БДУ)*

***Выхаванне студэнцкай моладзі*** на юрыдычным факультэце ажыццяўляецца ў адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі выхаваўчай і ідэалагічнай работы з моладдзю ў Рэспубліцы Беларусь, планамі выхаваўчай і ідэалагічнай работы БДУ і юрыдычнага факультэта, а таксама з улікам традыцый, што склаліся на факультэце. У гэтым задзейнічаны дэканат, куратары, супрацоўнікі гісторыка-патрыятычнага цэнтра "Памяць", Музей правазнаўства, студэнцкі актыў, студэнцкі савет інтэрната, студэнцкі навуковы савет, рэдкалегія студэнцкай газеты, інтэлектуальны клуб, КВЗ.

Уключэнне студэнтаў у арганізацыю вучэбна-выхаваўчага працэсу адбываецца ў наступных формах:

- дзейнасць органаў студэнцкага самакіравання: арганізацыя сустрэч з кіраўнікамі праваахоўных органаў, органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;

- арганізацыя конкурсаў-аглядаў ("Найлепшы куратар", "Найлепшы выпускнік", "Найлепшы спартсмен");

- мерапрыемствы прафілактычнай скіраванасці: праца Савета па прафілактыцы правапарушэнняў (індывідуальныя гутаркі са студэнтамі групы рызыкі, работа з бацькамі); праца з іншагароднімі студэнтамі па выкананні правілаў пражывання ў інтэрнаце; азнаямленне студэнтаў з правіламі ўнутранага працоўнага распарадку; растлумачальная праца сярод студэнтаў па выкананні дысцыпліны і правапарадку, прафілактыцы СНІДу, наркаманіі, курэння;

- грамадзянскае, патрыятычнае і ідэалагічнае выхаванне: правядзенне дзён інфармавання; работа гісторыка-патрыятычнага цэнтра "Памяць" (сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, правядзенне дзён права ў гімназіях, ліцэях, сярэдніх школах, арганізацыя мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню Дня абаронцы Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Дня Перамогі і Дня Рэспублікі); правядзенне "круглых сталоў", семінараў з найвышэйшымі службовымі асобамі дзяржавы; размяшчэнне пастаянных выставачных стэндаў "Ідэалогія беларускай дзяржавы" і "Юрысты факультэта ў СМІ Беларусі";

- маральна-духоўнае і эстэтычнае выхаванне, культурна-масавая работа: азнаямленне студэнтаў факультэта з Маральна-этычным кодэксам студэнта юрыдычнага факультэта (афіцыйна прыняты сходам студэнтаў факультэта і апублікаваны ў лютым 2007 г.);

- інфармацыйна-выхаваўчая работа: сайт факультэта www.law.bsu.by (форум); студэнцкая малатыражная газета "Выспа Юфь"; выступленне студэнтаў і выкладчыкаў факультэта ў СМІ Беларусі па актуальных праблемах; насценгазеты, плакаты, афармленне стэндаў.

На юрыдычным факультэце ажыццяўляюцца наступныя выхаваўчыя праграмы:

1. Праграма па адаптацыі студэнтаў I курса – Дзень першакурсніка, знаёмства з гісторыяй і традыцыямі факультэта.

2. Праграма "За здаровую моладзь": 1) удзел у спартыўных спаборніцтвах факультэта, БДУ, Беларусі, чэмпіянатах Еўропы і свету; 2) аздараўленне на базе санаторыя-прафілакторыя БДУ; 3) турыстычныя паходы.

3. Праграма "Працоўнае лета": 1) работа ў будатрадах; 2) работа ў грамадскай прыёмнай БДУ; 3) праходжанне вучэбнай практыкі; 4) дні юрыдычнага факультэта; 5) дні паэзіі, маці, юрыста, студэнта; 6) злёт студэнтаў юрыдычнага факультэта і навучэнцаў г. Маладзечна, прымеркаваны да Дня Перамогі; 7) канцэрт "Фабрыка зорак"; 8) конкурсы "Багіня Феміда", "Містэр юрфак"; 9) серыя гульняў інтэлектуальнага клуба "Што? Дзе? Калі?", КВЗ; 10) канцэрты музычных калектываў (гурты "Моцарт", "Мон-Блан"); 11) "Вясенні тыдзень дабрыні–2007".

Выхаваўчая работа на юрыдычным факультэце пабудаваная такім чынам, каб навучэнская моладзь магла не толькі павышаць свой адукацыйны ўзровень, атрымоўваць неабходныя веды, але і рэалізоўваць свае здольнасці па-за рамкамі навучальнага працэсу.

Дэканат, грамадскія арганізацыі, куратары плануюць правядзенне мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё пачуцця гонару ў студэнтаў за абраную прафесію, павышэнне адказнасці. Мы практыкуем таксама традыцыю напісання лістоў-падзяк нашым найлепшым студэнтам.

У рамках ***праграмы "Здароўе"*** студэнты і супрацоўнікі юрыдычнага факультэта прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх спартыўных мерапрыемствах універсітэта. У 2006–2007 навучальным годзе факультэт заняў I месца па такіх відах спорту, як валейбол (жаночая каманда), валейбол (мужчынская каманда), настольны тэніс, барацьба дзюдо (жаночая каманда), каратэ. Студэнтамі юрыдычнага факультэта з'яўляюцца вядомыя спартсмены: А. Бас, Д. Каптур, С. Невяроўскі, Н. Цылінская, К. Янушкевіч, А. Савеня, В. Скрыпкіна.

Гарманічнае развіццё універсітэта немагчымае без балансу інтарэсаў розных узроўняў: універсітэт – факультэт – структурнае падраздзяленне факультэта. Безумоўна, ёсць праблемы, якія немажліва вырашыць на ўзроўні факультэта. Напрыклад, вельмі востра стаіць пытанне адсутнасці расходных матэрыялаў і канцылярскіх прылад (уключаючы паперу). На працягу ўсяго навучальнага года факультэт не атрымаў ніводнай адзінкі.

Напрыканцы дазвольце прамовіць цёплыя словы падзякі супрацоўнікам усіх службаў рэктарата, іншых факультэтаў, якія з поўнай аддачай дапамагаюць забяспечваць вучэбны працэс і жыццядзейнасць юрыдычнага факультэта БДУ.

# АБ ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ РАЗВІЦЦЯ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА Ў 2004-2006 гг.

## З даклада начальніка Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Людмілы Хухлындзінай

Для праверкі юрыдычнага факультэта загадам рэктара была створана камісія ў наступным складзе: прарэктар па вучэбнай рабоце У.Л. Клюня (старшыня камісіі), начальнік ГУ ВНМР Л.М. Хухлындзіна (намеснік старшыні), дырэктар ЦІТ Ю.І. Варатніцкі, начальнік УК А.Д. Клімковіч, начальнік УПКВК К.М. Каросцік, дэкан філфака І.С. Роўда, начальнік НДЧ У.В. Панарадаў, дэкан гістфака С.М. Ходзін. Акрамя таго, да праверкі факультэта былі далучаны спецыялісты Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы і сацыялагічнай лабараторыі. Перш-наперш камісія адзначыла, што на факультэце праведзена вялікая работа па выкананні праграм перспектыўнага развіцця БДУ. Факультэт здзяйсняе падрыхтоўку кадраў па трох спецыяльнасцях: "Правазнаўства", "Эканамічнае права", "Паліталогія". У вучэбных планах і праграмах улічаны сучасныя патрэбы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.



Дыяграма 1. Кадравы патэнцыял

На дзесяці кафедрах факультэта працуюць 125 штатных выкладчыкаў. У параўнанні з 2004 г. колькасць унутраных сумяшчальнікаў паменшылася на 9 чалавек (з 61-го да 52-х), але павялічылася колькасць выкладчыкаў, якія працуюць на ўмовах знешняга сумяшчальніцтва (з 49-ці да 57-мі). 5 загадчыкаў кафедраў працуюць на грамадскіх пачатках. Сярод штатных супрацоўнікаў 15 дактароў і 78 кандыдатаў навук (74,4 %). У параўнанні з 2004 г. колькасць выкладчыкаў з вучонай ступенню кандыдата ці доктара навук паменшылася на 9,9 %. На дыяграме 1 відаць, што пры колькасным росце ПВС колькасць кандыдатаў навук памяншаецца. Спецыяльныя дысцыпліны выкладаюць вядучыя спецыялісты з дзяржаўных прававых органаў.

Юрыдычны факультэт – дастаткова малады па ўзроставым саставе. Сярэдні ўзрост выкладчыкаў складае 44 гады. Разам з тым 70 % дактароў навук ва ўзросце звыш 65-ці гадоў, а 4 дактары – звыш 80-ці. За перыяд з 2002 па 2006 гг. сваю кваліфікацыю павысілі толькі 51 выкладчык, з іх 11 чалавек – за мяжой.

Камісія падчас арганізацыі праверкі факультэта правяла сацыялагічнае апытванне студэнтаў чатырох курсаў (болей за 200 чалавек) і параўнала з данымі за мінулыя гады. На пытанне "Ці падабаецца Вам вучыцца на факультэце?" пераважная большасць адказала "Так". У параўнанні з 2002 г. гэты паказчык узрос на 4,4 %. Такія ж адказы былі атрыманыя і на пытанне "Ці падабаецца Вам абраная спецыяльнасць?" (97,2 % – у 2007 г., 94,1 % – у 2002 г.).

Студэнты высока ацанілі прафесійны ўзровень выкладчыкаў (гл. дыяграму 2) і арганізацыю вучэбнага працэсу на факультэце (гл. дыяграмы 3, 4, 5). Сярод найцікавейшых і найважнейшых прадметаў былі названы "Крымінальнае права" 30,5 %), "Грамадзянскае права" (16,4 %), "Канстытуцыйнае права" (7,8 %) і "Крыміналістыка" (6,9 %).

Дыяграма 2. Прафесійны ўзровень выкладчыкаў




Дыяграма 3. Запатрабаванасць прадметаў у будучай працы




Дыяграма 4. Перагружанасць вучэбных праграм




Дыяграма 5. Задаволенасць раскладам заняткаў




92,7 % студэнтаў адзначылі, што выкладчыкі арыентуюць іх на актыўную самастойную працу падчас семестра. Узмацніўся кантроль за арганізацыяй самастойнай працы з боку дэканата і факультэцкіх кафедраў.У выкладанні асноўных прадметаў прафесійнай падрыхтоўкі ўкараняецца рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў. На факультэце шырока выкарыстоўваюцца стратэгіі актыўнага навучання, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням. Шмат у чым гэта заслуга вучэбна-метадычнай камісіі факультэта на чале з прафесарам В.М. Бібіла.

Разам з тым аналіз паспяховасці (зімовыя сесіі) сведчыць пра зніжэнне абсалютнай паспяховасці, рост колькасці студэнтаў, што атрымліваюць нездавальняючыя адзнакі, і памяншэнне колькасці выдатнікаў (гл. табліцу). Гэта тлумачыцца не столькі ростам патрабаванняў з боку выкладчыкаў, колькі тым, што не ўсе студэнты платнай формы навучання маюць дастатковую базавую падрыхтоўку.

Табліца. Аналіз паспяховасці

| Год | Абсалютная паспяховасць (у %) | Працэнт тых, хто здаў сесію на "выдатна" | Працэнт тых, хто атрымаў "нездавальняюча" |
|---|---|---|---|
| 2003/2004 | 84,66 | 17,5 | 3,4 |
| 2004/2005 | 85,49 | 12,3 | 6,03 |
| 2005/2006 | 80,66 | 9,2 | 11,4 |
| 2006/2007 | 80,1 | 10,8 | 12,2 |

Асабліва гэтая тэндэнцыя прасочваецца на завочным аддзяленні, дзе абсалютная паспяховасць знізілася з 72-х % у 2004–2005 навуч. г. да 52-х % у 2006–2007 навуч. г. (вынікі зімовых сесій).

За апошнія тры гады паменшылася колькасць выпускнікоў, якія маюць дыпломы з адзнакай. Так, калі ў 2003 г. іх было 17,7 %, то ў 2006 г. – толькі 9,1 %. Адзначым, што гэта характэрна не толькі для юрыдычнага, але і для ўсіх факультэтаў універсітэта. У цэлым па БДУ ў 2003 г. дыпломы з адзнакай атрымалі 20,8 % выпускнікоў, у 2006 г. – толькі 9 %.

У вучэбны працэс актыўна ўкараняюцца камп'ютарныя тэхналогіі. Факультэт праводзіць работу па безупыннаму навучанні інфармацыйным тэхналогіям на працягу ўсяго перыяду навучання ва універсітэце. Пры апытанні толькі 3 % студэнтаў адзначылі, што не валодаюць камп'ютарам.

Для арганізацыі вучэбна-метадычнага забеспячэння самастойнай працы студэнтаў праведзена вялікая работа па стварэнні інфармацыйных рэсурсаў, даступных на сайце факультэта. Створана электронная бібліятэка, забяспечаны доступ студэнтаў да прававых баз, якія пастаянна абнаўляюцца.

Разам з тым адзначаецца нераўнамернае забеспячэнне ВМК па факультэцкіх кафедрах. На кафедральных сайтах таксама не стае дастатковай колькасці вучэбнай літаратуры.

Факультэт удзельнічае ў выкананні 9-ці навуковых тэм, у тым ліку 3 з іх – у рамках Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў "Эканоміка і грамадства" (2006–2010 гг.). З 2001 па 2006 гг. апублікавана 83 манаграфіі, 170 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў (з іх 7 маюць грыф Міністэрства адукацыі). Узрасла колькасць навуковых распрацовак, якія выкарыстоўваюцца ў народнай гаспадарцы і ў вучэбным працэсе (гл. дыяграму 6).

Дыяграма 6. Выкарыстанне навуковых распрацовак




Кіраўніцтва факультэта павінна звярнуць увагу на арганізацыю студэнцкай навукі. Асобныя колькасныя паказчыкі НДРС на юрфаку ніжэйшыя за сярэднія па БДУ. Між тым, у БДУ і ў цэлым па рэспубліцы створаны ўмовы для рэалізацыі навуковай актыўнасці студэнтаў.

Нізкая актыўнасць НДРС, адсутнасць дакладнай сістэмы арганізацыі і інфарматыўнага забеспячэння студэнтаў і ПВС у сферы НДРС на самім факультэце прыводзіць да таго, што тыя, хто паступае ў аспірантуру, маюць слабую навуковую аснову і не паспяваюць давесці да канца дысертацыю ў перыяд навучання ў аспірантуры. У выніку эфектыўнасць аспірантуры на факультэце ніжэйшая за сярэдні паказчык па БДУ. Своечасовыя абароны адсутнічаюць па 6-ці спецыяльнасцях. На працягу 2005–2006 гг. своечасова абаронена толькі 3 кандыдацкія дысертацыі.

Падводзячы вынікі, камісія прапанавала Вучонаму савету універсітэта ў цэлым ухваліць работу факультэта па выкананні праграм перспектыўнага развіцця і адзначыла, што надалей прыярытэтнымі напрамкамі ў рабоце факультэта павінны стаць:

- удасканаленне арганізацыі самастойнай работы студэнтаў;
- паглыбленне практычнай накіраванасці ў падрыхтоўцы кадраў;
- удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі магістраў;
- павышэнне эфектыўнасці работы НДРС і аспірантуры;
- узмацненне ідэалагічнай і выхаваўчай работы.

УНІВЕРСІТЭТ

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# СТУДЭНЦКІЯ АТРАДЫ: СУЧАСНАЯ МОЛАДЗЬ ЗА СТАРЫЯ ТРАДЫЦЫІ

### БУДАВАЦЬ, ВЫХОЎВАЦЬ І ДАПАМАГАЦЬ

Улетку плануецца працаўладкаваць каля 800 студэнтаў нашага універсітэта. Як паведаміў начальнік штаба працоўных спраў БРСМ БДУ Дзмітрый Лебедзь, зараз наладжаны працоўныя сувязі з мінскімі будтрэстамі № 4 і № 7. Такім чынам, нашы студэнцкія атрады прымуць удзел у будаўніцтве ў сталіцы спартыўнага цэнтра "Мінск-арэна" і кінатэатра "Беларусь". Будуць працаваць і сельгасатрады ў РУП "Шчомысліца" пры БДУ. Ва універсітэцкі САК "Брыганціна" і дзіцячы аздараўленчы лагер "Зорка" пры "Белмедпрэпаратах" накіруюцца педагагічныя атрады. Таксама арганізаваны валанцёрскія атрады, якія бескарысна збіраюцца дапамагаць ветэранам БДУ, дзіцячым садкам, працаваць у складзе прыёмнай камісіі і г. д. Яшчэ Цэнтральны камітэт БРСМ дамаўляецца з маладзёжнымі арганізацыямі Расіі і Украіны наконт выезду беларускіх студэнтаў на працу ў гэтыя краіны. Акрамя гэтага, 10 атрадаў агульнай колькасцю 150 чалавек будуць працаваць на добраўпарадкаванні інтэрнатаў і прылягаючых да іх тэрыторый. Іх арганізуе Студгарадок БДУ сумесна з Мінскім цэнтрам занятасці, які выдзеліў на гэтыя мэты 30 млн рублёў. Дарэчы, іншагароднім студэнтам, што вырашылі папрацаваць летам, будзе падоўжаны тэрмін пражывання ў інтэрнатах на адпаведны перыяд.

### І КНІЖКІ ПАЧЫТАЦЬ, І ГРОШЫ ЗАРАБІЦЬ...

Будаўнічыя атрады заўсёды карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод моладзі. Яны вырашаюць праблему занятасці і даюць магчымасць за месяц папоўніць студэнцкі бюджэт на 450–500 тыс. рублёў. У будатрады студэнты найчасцей ідуць па рэкамендацыях сваіх сяброў. Маўляў, я там быў і ты паспрабуй. І некаторыя адважваюцца паспытаць гэтага хлеба.

Аднак студэнцкія атрады – з'ява далёка не новая. Гэта ўзнаўленне добрых традыцый камсамола. Студэнт у рабочай форме колеру хакі ў савецкія часы меў вялікую пашану і з павагай называўся байцом.

Ці прэстыжна сёння лічыцца байцом студэнцкага атрада? Ці павявае ад гэтага ўсё яшчэ рамантыкай? Студэнт ІІІ курса гістарычнага факультэта Сяргей Койда, які працаваў у найлепшым па выніках гарадскога конкурсу "Працоўнае лета-2006" будаўнічым атрадзе, адказаў, што слова "баец" хутчэй адносіцца да ваенізаванай арганізацыі. Ён жа сябе бачыў звычайным рабочым і ішоў у атрад як на працу. І гэта натуральна.



*Разам працуем – моцна сябруем: студатрад БДУ на адной з будоўляў*

"Тыя кніжкі, якія мы чытаем ва універсітэце, зразумела, зрабілі сваю справу. І многія з нас ужо не могуць адносіцца да звычайных рэчаў папросту. Але некаторыя студэнты часам адрозніваюцца інтэлектуальнай фанабэрыстасцю пры поўнай адсутнасці самастойнасці, залішняй залежнасцю ад бацькоў і няўменнем па-даросламу ставіцца да жыцця", – адзначыў Сяргей Койда. Падчас будаўніцтва гасцініцы "Еўропа" нашым хлопцам давялося працаваць побач са сваімі равеснікамі, такімі ж юнакамі гадоў дваццаці пасля ПТВ, якія выбралі сабе рабочую прафесію. Пра "вумныя" кніжкі і мінулую сесію тады гаварылі мала. Больш слухалі сваіх новых знаёмых, якія расказвалі "сябрам-інтэлектуалам" пра цікавыя здарэнні з уласнага працоўнага побыту. Напрыклад – як забылі бетонамяшалку ў кватэры дома, які будаваўся, і толькі калі той здавалі, знайшлі яе. "Гэта такія ж хлопцы, як і мы, – гаворыць Сяргей, – Гэтулькі кніжак яны не чытаюць, але ўжо могуць зарабіць сабе на жыццё". Для студэнтаў, не звыклых да цяжкай фізічнай працы, пагрузачныя і разгрузачныя работы, што ім даверылі, аказаліся нялёгкай задачай. Для таго, каб падняць цяжкі мех з цэментам, патрэбна досыць сілы... Аднак пасля пастаяннага напружання мазгоў фізічная праца якраз дарэчы, бо не дазваляе атрафіравацца мышцам і падтрымлівае цела ў тонусе. Праўда, нашым хлопцам не прыйшлося паспрабаваць усіх "прывабнасцяў" працы будаўніка, дзе патрэбна хоць нейкая кваліфікацыя. Напрыклад, ім не дазвалялася знаходзіцца ля бетонамяшалак і іншых механічных сродкаў. Але на даручаным ім участку студэнты працавалі старанна і насамрэч заслужылі заробленыя грошы. І хоць хлопцы не жылі ў палявых умовах, а раз'язджаліся ўвечары хто дамоў, а хто ў інтэрнат, яны памяталі, што застаюцца атрадам і пасля працоўнага дня: сумесна гулялі ў футбол, некалькі разоў хадзілі ў паход. Працоўнае лета прайшло даволі насычана. Успаміны – самыя лепшыя.

### БАЕЦ – З КВАЛІФІКАЦЫЯЙ

Любыя традыцыі ўзнаўляюцца і жывуць дзякуючы людзям, якія іх добра ведаюць і могуць падзяліцца сваім вопытам. У нашым універсітэце, напрыклад, – гэта Вячаслаў Малафееў, старшы выкладчык факультэта радыёфізікі і электронікі, намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ. За ўдзел у студатрадаўскім руху Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР у свой час узнагародзіў яго медалём "За працоўныя заслугі". Вобраз "байца" студэнцкага атрада, які едзе ў самыя адказныя кропкі краіны з гітарай у руках і песнямі, па яго словах, быў крыху рамантызаваны і ідэалагічна вытрыманы. Тое, што студэнты аказваліся на самых важных будоўлях дзяржавы, трэба падкрэсліць. Асваенне цаліны, чарназем'я, будаўніцтва БАМа – гэта гістарычны факт. Аднак ехалі яны туды не дзеля рамантычных прыгод, а як і цяпер, каб зарабіць грошы. 600, 1000 савецкіх рублёў – не самыя вялікія заробкі, якія студэнты атрымоўвалі на будоўлях Наваржэва (Пскоўская вобласць), Лоўхаў ( Карэлія), а таксама ў Якутыі, Малдавіі. Можна было зарабіць нават каля 2 000 рублёў. Гэта ў той час, калі "Масквіч" каштаваў 4 000 рублёў.

Праблема занятасці студэнтаў летам пры гэтым таксама вырашалася. Аднак у першую чаргу самі прадпрыемствы былі зацікаўлены ў студэнцкай дапамозе. Асабліва там, дзе не хапала працоўных рук. Паміж прадпрыемствамі мелася нават нейкая канкурэнцыя і барацьба за лепшыя студэнцкія атрады. Такім чынам, супрацоўнікі штабаў студэнцкіх атрадаў апыналіся гаспадарамі становішча і накіроўвалі сваіх падапечных туды, дзе іх належным чынам забяспечвалі працай, размяшчалі і арганізоўвалі харчаванне. У той час дзяржава была зацікаўлена ў дадатковай сіле і студэнцкі рух знаходзіў падтрымку на самым высокім узроўні. Аб гэтым сведчыць сама арганізацыя руху: ствараліся шматлікія студэнцкія працоўныя штабы, якія каардынавалі работу атрадаў у розных кропках вялікай краіны і хутка высвятлялі, дзе найбольш патрэбная працоўная моладзь; а таксама ладзіліся ўсялякія курсы на базе прафтэхвучылішчаў, дзе студэнты праходзілі навучанне і атрымоўвалі кваліфікацыю каменшчыкаў, цесляроў, бетоншчыкаў і інш. Дзякуючы гэтаму студэнты маглі самі будаваць жывёлагадоўчыя комплексы, школы, жылыя дамы, дарогі, меліяратыўныя збудаванні.

Вячаслаў Малафееў, напрыклад, засвоіў прафесію цесляра і бетоншчыка і штогод удзельнічаў у будоўлях Мінскай, Пскоўскай абласцей, у Карэліі. Яго працоўны досвед і навыкі вельмі цаніліся пры фарміраванні новага студэнцкага атрада.

Студатрадаўскі рух сапраўды з'яўляўся рухам, бо ў ім была задзейнічана вялікая колькасць моладзі. Звычайна летам у будаўнічыя атрады выязджала каля 70 % студэнтаў з тых факультэтаў, дзе не было летніх практык. Так званыя занальныя атрады БДУ ў Карэлію, Малдавію, Якутыю налічвалі каля 1000–2000 чалавек кожны. Паколькі будоўлі былі адказнымі, а самі атрады – дастаткова шматлікімі (з розных ВНУ), то і іх арганізацыя нечым нагадвала вайсковую. Атрады ўзначальвалі камандзіры і камісары, іх члены называліся байцамі і насілі форму колеру хакі. Зразумела, нейкі ідэалагічны падтэкст у існаванні студэнцкіх будаўнічых атрадаў прасочваўся: немалаважнай была наяўнасць у атрадзе агітбрыгады, якая арганізоўвала розныя фестывалі, а таксама праводзіла шэфскую работу ў сельскіх школах і г. д. Тут, канешне, не абыходзілася без песень. Але гэта хутчэй было дзеля запаўнення вольнага часу. Галоўнай жа з'яўлялася сама праца, а менавіта будоўля.

**Ганна ЛАГУН**

ПАДПІСКА — 2007

## "ВЕСНІК БДУ"

**Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2007 года.**

**Падпісная цана на часопіс "Веснік БДУ" па серыях:**

**Серыя I** – фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень): індывідуальная (індэкс 74851) – 9 320 р. (Белпошта), 8630 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748512) – 29 057 р. (Белпошта), 27172 р. (Белсаюздрук).

**Серыя II** – хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік): індывідуальная (індэкс 74852) – 9 320 р. (Белпошта), 8630 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748522) – 29 057 р. (Белпошта), 27172 (Белсаюздрук).

**Серыя III** – гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад): індывідуальная (індэкс 74853) – 18 650 р. (Белпошта), 17260 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748532) – 58 144 р. (Белпошта), 54345 р. (Белсаюздрук).

**Серыя IV** – філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань): індывідуальная (індэкс 74854) – 18 650 р. (Белпошта), 17260 р. (Белсаюздрук); ведамасная (індэкс 748542) – 58 144 р. (Белпошта), 54345 р. (Белсаюздрук).

**Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.**

Часопіс "Веснік БДУ" ўсіх чатырох серый можна набыць у кіёску галоўнага корпуса БДУ (пр. Незалежнасці, 4), серыю III – у кіёску "Універсітэцкая кніга" (вул. Ленінградская, 8).

**Самы танны і надзейны спосаб атрымаць часопіс – гэта падпіска.**

## ЧАСОПІС ДЛЯ САЦЫЁЛАГАЎ

**Навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" —**

першае ў Рэспубліцы Беларусь перыядычнае выданне па пытаннях сацыялогіі. У ліку аўтараў часопіса вядучыя сацыёлагі Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краінаў СНД, а таксама ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Польшчы і інш.

Часопіс уключаны Прэзідыумам ВАК Беларусі ў лік выданняў для публікацыі матэрыялаў пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Часопіс разлічаны на чытачоў, якія спецыялізуюцца ў галіне сацыялогіі, а таксама сумежных галінах навукі: выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў-практыкаў.

Перыядычнасць выхаду часопіса — 1 раз у квартал.

Цана падпіскі на навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" на паўгоддзе складае:

для індывідуальных падпісчыкаў — 20580 р. (кошт аднаго нумара 10290 р.). Падпісны індэкс — 74932;

для ведамаснай падпіскі — 55242 р. (кошт аднаго нумара 27621 р.). Падпісны індэкс — 749322.

Падпісацца на часопіс "Социология" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі РА "Белпошта" Рэспублікі Беларусь ("Каталог газет і часопісаў Рэспублікі Беларусь на другое паўгоддзе 2007 г.", с. 246).

У ПРАФКАМЕ

# ПРАВАВАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ ПРАФСАЮЗА

**Змястоўныя зборнікі дыдактычных прававых актаў і метадычных матэрыялаў атрымалі сабе ў дапамогу прафгрупаргі першых курсаў ВНУ сталіцы падчас семінара, праведзенага ў сярэдзіне мая Беларускім прафесіянальным саюзам супрацоўнікаў адукацыі і навукі і Каардынацыйным саветам старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі.**

Па словах старшыні Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Ніны Радзевіч, студэнты часам не карыстаюцца сваімі правамі, таму што не ведаюць іх. Данесці адпаведную інфармацыю павінны ў першую чаргу прафсаюзныя лідары, дзеля падрыхтоўкі якіх у БДУ ладзяцца шматлікія выязныя злёты, агульнауніверсітэцкія і факультэцкія семінары. Згодна з Палажэннем аб школе прафсаюзнага навучання, прынятым 20 красавіка гэтага года, могуць выкарыстоўвацца і іншыя формы падрыхтоўкі. Напрыклад, у БДУ для прафгрупаргаў першага курса арганізоўваюцца нават начныя дыскатэкі ў гумарыстычнай форме прафсаюзнага сходу.

Трэба заўважыць, што прафкам навучэнскай моладзі БДУ дзейнічае паралельна з іншымі маладзёжнымі грамадскімі структурамі. Гэта камітэт БРСМ і органы студэнцкага самакіравання. "Мы павінны навучыць нашых падапечных узаемадзейнічаць з іншымі актывістамі і дакладна ўсведамляць ролю прафсаюзнага лідара, якая заключаецца перш-наперш у забеспячэнні сацыяльных патрэбаў студэнтаў", – адзначае Ніна Радзевіч. Сёння прафгрупаргі могуць істотна паўплываць на прадстаўленне скідак за навучанне, перавод з платнай формы навучання на бюджэтную, назначэнне стыпендый (і не толькі сацыяльных), матэрыяльнае стымуляванне і нават сам вучэбны працэс. Не за гарамі той час, калі будзе падпісана пагадненне паміж рэктарам і Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў накшталт калектыўнай дамовы з супрацоўнікамі ВНУ. Таму для прафгрупарга вельмі важна быць дасведчаным у прававым аспекце.

Напрыканцы кожны ўдзельнік семінара атрымаў "Дзённік прафгрупарга", у якім вялікая ўвага надаецца аналізу сацыяльнай характарыстыкі прафгрупы.

**Ганна ЛАГУН**

## БДУ ў СМІ Беларусі

**Апошні званок у ліцэі БДУ** – "Вечерний Минск" (25.05).

**Семінар-практыкум для студактыву БДУ ў "Брыганціне"** – "Знамя юности" (25.05).

**Семінар факультэта журналістыкі БДУ ў Вілейцы** – "Звязда" (25.05).

**Візіт дэлегацыі БДУ ў Ізраіль** – БелТА (24.05).

**Сусветны Дзень роднай мовы на факультэце журналістыкі БДУ** – "Звязда" (23.05).

**Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні ў Інстытуце тэалогіі БДУ** – БелТА (23.05, 24.05); tut.by (24.05); interfax.by (24.05).

**Вынікі ўступнай кампаніі ў ліцэй БДУ** – БелаПАН (21.05); tut.by (21.05); БелТА (22.05); naviny.by ( 22.05); "Народная газета" (25.05); " Звязда" (25.05).

**Патрыятычна-асветніцкая акцыя "Вязынка–2007"** – БелТА (19.05).

**Міжнародная навуковая канферэнцыя "Авангард і культура: мастацтва, дызайн, асяродзе", падрыхтаваная ДзІКСТ БДУ** – "Минский курьер" (19.05); БелТА (19.05).

**Удзел БДУ у Беларускім прамысловым форуме** – "Минский курьер" (17.05).

**Інстытут бізнесу і мэнеджмэнту тэхналогій БДУ – каардынатар падрыхтоўкі кіруючых кадраў паводле падпісанага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам эканомікі нашай краіны і Міністэрствам эканомікі і тэхналогій ФРГ** – БелТА (15.05); БелаПАН (16.05); "Рэспубліка" (16.05); tut.by (16.05); naviny.by (16.05); generation.by (16.05); "Экономическая газета" (18.05).

**Выстава да Дня сям'і Саюза жанчын БДУ** – "Минск-новости" (16.05).

**Перамога каманды БДУ на Рэспубліканскай алімпіядзе па матэматыцы** – БелТА (15.05).

**Інтэрв'ю намесніка дырэктара ліцэя БДУ Ігара Вараксы, заданні па сусветнай гісторыі, рускай мове і літаратуры для падрыхтоўкі ў ліцэй БДУ, а таксама па матэматыцы і хіміі для падрыхтоўкі ў БДУ, інтэрв'ю з дэканам факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ Сцяпанам Мулярчыкам** (час. "Репетитор", № 4).

**Інтэрв'ю з дэканам хімічнага факультэта БДУ Уладзімірам Паньковым** (час. "Репетитор", № 5).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# СТУДЭНТЫ ПРАГНУЦЬ РАЗНАСТАЙНАСЦІ!

***Няма такога студэнта, які хоць бы раз у жыцці не прагуляў пары. Нават "вялікія батанікі" за час вучобы не аднойчы дазвалялі сабе "маленькія слабасці". Што ж казаць пра звычайнага студыёза, які імкнецца апраўдаць свае пропускі адгаворкамі кшталту "там нецікава" ці "мне ў жыцці гэта не спатрэбіцца"?***

Звыклая формула "лекцыя – семінар – ацэнка" з трактоўкай "запісваем пад дыктоўку – чытаем з канспекта – пішам шпаргалкі – атрымліваем адзнаку" ўжо неактуальная. З развіццём новых інфармацыйных тэхналогій з'явіліся шырокія магчымасці зрабіць навучальны працэс для студэнтаў разнастайным, а матэрыял – больш даступным і лягчэйшым у засваенні.

Гэта з поспехам ажыццяўляюць на факультэце міжнародных адносін, дзе 29 красавіка адбылася вучэбная "відэалекцыя" вядомага амерыканскага прафесара Універсітэта Святога Томаса з Мінесоты Уінстана Крыслока па курсе "Гісторыя міжнародных адносін". Падчас відэадыялога на працягу 40 хвілін студэнтам II курса аддзялення "Міжнародныя адносіны" быў прадэманстраваны аўтарскі погляд на эвалюцыю знешняй палітыкі ЗША ў канцы XVIII–XIX стст. Усе прысутныя загадзя маглі пазнаёміцца з асноўнымі тэзісамі лекцыі, дасланымі па электроннай пошце. У камп'ютарным класе галоўнага корпуса БДУ вольных месцаў не засталося, бо паслухаць замежнага прафесара на англійскай мове і задаць яму пытанні прыйшлі таксама студэнты іншых курсаў.

Прафесар Крыслок даслаў намесніку дэкана Віктару Шадурскаму ліст, у якім выказаў сваё захапленне глыбінёй зададзеных пытанняў і выдатным веданнем студэнтамі англійскай мовы. Ён пажадаў прачытаць яшчэ некалькі лекцый на іншыя тэмы і прапанаваў нашым выкладчыкам таксама выступіць у рэжыме відэаканферэнцыі перад амерыканскімі студэнтамі.

Застаецца спадзявацца, што на факультэтах БДУ ў хуткім часе з'явіцца новае абсталяванне, якое дазволіць праводзіць такія канферэнцыі на больш высокім тэхнічным узроўні.

Паболей бы гэткіх заняткаў у выглядзе дыскусій і ролевых гульняў, і студэнты не будуць "завальвацца" на заліках і іспытах.

**Наталля АТРАШКОВА**

# "ГАРМОНІЯ СМАКУ – ГАРМОНІЯ ВА ЎСІМ!"



*З рога ўсяго многа: гастранамічны парад у Студгарадку*

***Такім дэвізам распачала новы для студэнтаў БДУ конкурс "Смак–2007" каманда кулінараў з інтэрната № 7 і не памылілася. І не таму, што ў выніку перамагла, а хутчэй таму, што гэтыя словы найлепшым чынам перадалі цёплую (ва ўсіх адносінах), па-хатняму добрую атмасферу мерапрыемства, якое адбылося 23 красавіка ў інтэрнаце № 2.***

Што такое кулінарны марафон, пэўна, тлумачыць не трэба. Ідэя не новая: за дакладны час з вызначанай колькасці прадуктаў (склад якіх удзельнікі не ведаюць) неабходна прыгатаваць традыцыйныя альбо ўласна прыдуманыя стравы. Яны мусілі быць не толькі смачнымі, але і прыгожымі, каб не сорам было паказаць. Тэлевізійныя кулінары-карыфеі Андрэй Макарэвіч, Джэймі Олівер і Юлія Высоцкая пашкадавалі б, што не трапілі на вечарыну, бо ўзровень нашага "Смаку" паказаў, што есці па-студэнцку – гэта не толькі заварыць у кубку "Роллтон" ці зрабіць канапкі. Удзельнікі конкурсу (па чацвёра энтузіястаў з кожнага інтэрната) увасобілі дух алімпійскага "Хутчэй, вышэй, мацней". Хутчэй – бо на прыгатаванне трох страў адводзілася толькі гадзіна з паловай; вышэй – бо прыйшлося шпаркім крокам "браць вышыню" – камусьці дасталася кухня і на 13-м паверсе; мацней – бо па ўмовах конкурсу свае вырабы трэба было яшчэ і абараніць (ад галоднай судзейскай калегіі!). І тут студэнцкай фантазіі не было мяжы: ад былiннага пераказу этапаў прыгатавання да танцаў, спеваў, невялічкіх стэмаў і нават акрабатычных нумароў! Вядома, студэнты – народ вясёлы.

Але галоўнае, дзеля чаго ўсе і сабраліся ў канферэнц-зале "двойкі" – гэта кулінарнае майстэрства. Шчыра сказаць – усё выглядала выдатна, асабліва ўразілі дэсерты, рэцэпты якіх дазвалялася прадумаць загадзя з выкарыстаннем уласных прадуктаў. Што тычыцца якасці страў, то лепей за членаў журы пра гэта ніхто не распавядзе – ім давялося ўсё дакладна пакаштаваць.

Жарты жартамі, але прыйшлося пагадзіцца, што ў пытанні харчавання студэнту давяраць можна і нават хочацца. "Упэўнены, што кулінарны конкурс стане традыцыйным у БДУ, – адзначыў дырэктар Студгарадка Міхаіл Чарапеннікаў, – і ў наступным сезоне мы нават правядзём яго раней, дзесьці ў верасні... Цяпер зразумела, каб смачна паесці, не трэба далёка ісці, дастаткова падняцца на якую-небудзь кухню аднаго з нашых інтэрнатаў".

І нядзіўна, што конкурс завяршыўся агульнай нефармальнай дэгустацыяй, а традыцыйны абмен уражаннямі змяніўся абменам рэцэптамі, якія аргкамітэт конкурсу плануе выпусціць асобным буклетам, каб усе жадаючыя маглі пазнаёміцца з чараўніцтвам студэнцкай кухні.

**Марыя СЯБРОЎСКАЯ**

# ПАВОДЛЕ ПРЫНЦЫПАЎ ЭЛАДЫ

***17 мая 2007 года ў спартыўным комплексе "Універсітэцкі" прайшло закрыццё Спартакіяды інтэрнатаў Студэнцкага гарадка БДУ 2006–2007 навучальнага года.***

"Хочаш быць дужым – бегай,
хочаш быць прыгожым – бегай,
хочаш быць разумным – бегай!"

***(Надпіс на скале ў старажытнай Эладзе)***

Студэнты БДУ падпадаюць пад згаданыя характарыстыкі, бо з задавальненнем наследуюць гэтай парадзе, прымаючы актыўны ўдзел у спаборніцтвах паміж інтэрнатамі, якія праходзілі па дзевяці відах спорту: валейбол, настольны тэніс, баскетбол, більярд, міні-футбол, перацягванне каната, шахматы, плаванне, спартыўнае арыентаванне. Змаганне было напружанае, а яго вынікі – непрадказальнымі. Урэшце Кубак пераможцы Спартакіяды 2006–2007 перайшоў да каманды інтэрната №7, якая ўсяго на некалькі балаў пераўзышла інтэрнат № 4! На трэцім месцы размясцілася каманда інтэрната № 6. Усе калектывы за ўдзел у спаборніцтвах атрымалі салодкія падарункі, а прызёры і пераможцы, у тым ліку і ў асобных відах спорта, былі ўзнагароджаны граматамі і прызамі. Урачыстае падвядзенне вынікаў было цікавым і займальным, бо падчас яго праводзілася спартландыя, дзе кожная эстафета прадстаўляла пэўны від спорту.



*Узнагароджванне пераможцаў Спартакіяды*

Шчырая падзяка за арганізацыю і правядзенне Спартакіяды кафедры фізвыхавання і спорту, метадысту Студэнцкага гарадка БДУ Інэсе Аблаказавай і грамадскаму аб'яднанню "Апякунскі савет Студгарадка БДУ".

**Надзея БЫШКА**

# А ХТО ТУТ САМАЯ ЛЭДЗІ?

***У Юрыдычным каледжы БДУ адбыўся 25 мая конкурс прыгажосці.***



*"Лэдзі-каледж–2007" Аксана Шкляр (у цэнтры) разам з астатнімі ўдзельніцамі конкурсу*

Уладальніцай тытула "Лэдзі-каледж–2007" стала першакурсніца Аксана Шкляр. Званні "Віцэ-лэдзі" і "Лэдзі Фаварытка" прысуджаны навучэнцы трэцяга курса Святлане Марозавай. Самай артыстычнай прызнана трэцякурсніца каледжа Вольга Андросік, якая атрымала тытул "Лэдзі Арт". Навучэнка трэцяга курса Кацярына Тукіна ганаравана тытулам "Лэдзі Фота". А "Лэдзі Грацыяй" стала другакурсніца Настасся Галай.

Каб раскрыць свой шматгранны вобраз, прэтэндэнткам на карону прыйшлося прайсці праз сур'ёзныя выпрабаванні. Акрамя ўдзелу ў конкурсе "Вясёлкавы настрой" і дэфіле, яны павінны былі пазмагацца ў інтэлектуальным і творчым спаборніцтве. Ацэньвала таленты юных прыгажунь журы ў складзе педагогаў каледжа, інструктараў па фітнесе, аэробіцы, дэфіле, а таксама стыліста і псіхолага.

**Марыя АКУЛІК**

# У СТЫЛІ ROCK

Зусім нядаўна завяршыўся пробны праект Пярвічнай арганізацыі студэнтаў БДУ "ROCK–ФЭСТ–2007", які прайшоў 27–28 красавіка на філалагічным факультэце. У першым фестывалі ўдзельнічалі 15 рок-груп, прадстаўленых маладзёжнымі творчымі аб'яднаннямі студэнтаў БДУ гуманітарнага, гістарычнага, філалагічнага, юрыдычнага факультэтаў, а таксама ФРФіЭ, навучэнцамі Юрыдычнага каледжа і гасцямі канцэрта: "OZ" з БДАТУ, "Паўночны гатэль" з БДПУ імя Максіма Танка і "SHTOFF" з Гродна. На сцэне гучалі песні ў стылі рок, панк-рок, поп-электрыка, альтэрнатыва, power death metal, love goth metal.

Галоўнай мэтай фестывалю было далучэнне моладзі да розных формаў музычнай культуры, падтрымка і папулярызацыя студэнцкай музычнай творчасці, павышэнне ўзроўню выканальніцкага майстэрства студэнцкіх рок-груп, матывацыя прафсаюзнага членства і развіццё творчага абмену паміж ВНУ. Акрамя таго, фестываль рок-музыкі даў магчымасць студэнтам паспрабаваць свае сілы ў самастойнай арганізацыі канцэрта, паколькі аргкамітэт у асноўным складаўся з актывістаў прафсаюза.

Паводле правілаў фестывалю кожная група павінна была прадставіць 1–3 песні (па рашэнні аргкамітэта) ці інструментальныя кампазіцыі. Адбор да ўдзелу быў заснаваны на аўдыё-, відэа-, фотаматэрыялах, тэкстах песень і біяграфій груп. Адным з галоўных крытэрыяў з'яўлялася накіраванасць музыкі і тэкстаў.

Нягледзячы на тое, што праект "ROCK–ФЭСТ–2007" ладзіўся ўпершыню, арганізаваны ён быў на дастаткова высокім узроўні. Плануецца зрабіць такое мерапрыемства штогадовым. У далейшым яно будзе праводзіцца на конкурснай аснове і пры дапамозе больш магутнай апаратуры.

Цяпер застаецца толькі чакаць, калі на вялікіх сцэнах Мінска зноў загучыць музыка нашых студэнтаў у самых розных стылях!

**Алена САВІЦКАЯ**

# НЕЭМБЛЕМАТЫЧНЫ БАГУШЭВІЧ

***Пад такою назвай 10 мая на філфаку прайшла вечарына, падчас якой сябры кафедры гісторыі беларускай літаратуры спрабавалі па-новаму зірнуць на творчасць і жыццёвы шлях знакамітага пісьменніка.***

Францішак Багушэвіч – знакавая постаць у нацыянальнай культуры. Але яго імя стала ідэалагемай і ператварылася ў этнічна-сацыяльную эмблему. Сёння мы маем аднабокі вобраз пісьменніка. На ўзроўні масавай свядомасці Багушэвіч прызнаецца як аўтарытэт, але ён амаль памёр як аўтар, зрабіўся нецікавым як пісьменнік. Таму ўдзельнікі вечарыны не прапанавалі гледачам Багушэвіча-публіцыста, а заклікалі заглыбіцца ў яго тэксты.

Распачала "неэмблематычнае" знаёмства з пісьменнікам візуальная вандроўка: на праектары былі паказаны дакументы – метрычны запіс, вышскі з вучэбнай ведамасці, залікоўка, ліставанне з Элізай Ажэжка і інш., а таксама вокладкі кніг, фотаздымкі Багушэвіча ў важныя моманты жыцця. Акампанаваў паказу ўлюбёны інструмент пісьменніка – дудка.

Студэнты зладзілі інсцэніроўкі вершаванай аповесці "Кепска будзе!", апавядання "Сведка", верша "Хрэсьбіны Мацюка", падчас якіх сталі бачнымі розныя іпастасі пісьменніка – гумарыст і гуманіст, сатырык, парадыст... Выконвалі асобныя вершы ("Дагарае рэшта веццяя..."), песні на вершы ("Гарцуй, танцуй, пане!", "Шумяць сосны"), музычныя кампазіцыі і танцы. Быў Багушэвіч песімістычны, элегічны, рамантычны, нават антыэмансіпацыйны (інсцэніроўка "Дзе чорт не можа, там бабу пашле"). У сцэне "Тэлепанарама" студэнты ўявілі Багушэвіча журналістам і распавялі пра прозу філфакаўскага жыцця.

Без эмблем, аднак, не абышлося: напрыканцы імпрэзы загадчык кафедры Таццяна Казакова нагадала ўсім знакамітыя словы пісьменніка "не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі!".

Уражанне ад вечарыны засталося цёплае і радаснае – не толькі ад Багушэвіча, які быў адкрыты з новых ракурсаў, але і ад ініцыятыўных і вынаходлівых студэнтаў, што з імпэтам выходзілі на сцэну і энергічна дзяліліся сваёй любоўю да беларускай літаратуры.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

# КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

***У бягучым годзе выдавецтвам БДУ падрыхтавана да друку 105 арыгіналаў-макетаў вучэбных, даведачных і навуковых выданняў. З пачатку года пабачылі свет 80 кніг і брашур.***

***У хуткім часе будуць аддрукаваны тыражы кніг, якія былі падпісаны да друку ў мінулым годзе, што ў суме з сёлетнімі складае 135 найменняў.***

***Згодна з загадам "Аб стварэнні фонду электроннай бібліятэкі БДУ" выдадзеныя з пачатку года кнігі будуць перададзены ў электронным выглядзе Фундаментальнай бібліятэцы універсітэта.***

*Семенькова Г.Н.* **Гель-хроматография для выделения и очистки белков.** У практыкуме выкладзены агульныя звесткі аб храматаграфічных метадах выдзялення і ачысткі бялкоў, апісана методыка раздзялення сумесі бялкоў і нізкамалекулярных злучэнняў.

**Социальное взаимодействие.** У кнізе адлюстравана паслядоўнасць правядзення мерапрыемстваў, дакладна прадстаўлены майстар-класы, а таксама прэзентацыі студэнцкага псіхалагічнага клуба і клуба ролевых гульняў.

*Шавцова А.В.* **Права человека (Право прав человека).** У вучэбна-метадычны комплекс уключана праграма лекцый, заданні і тэксты для самастойнай працы, а таксама тэмы рэфератаў, курсавых і дыпломных работ.

**Грамматика английского языка для студентов биологического факультета = English Grammar for Biology Students. В 2 ч. Ч. 1.** Мэта дапаможніка – развіццё і ўдасканальванне навыкаў і ўмення перакладу як агульнанавуковай літаратуры, так і літаратуры па спецыяльнасці, паглыбленне ведаў у вобласці граматыкі англійскай мовы.

*Цзян Цзюнь.* **Методика преподавания современного китайского языка = 现代汉语教学法.** У дапаможніку




асвятляюцца раздзелы курса методыкі выкладання кітайскай мовы, прапаноўваюцца сучасныя метадычныя падыходы ў вывучэнні маўленчага матэрыялу і відаў маўленчай дзейнасці.

**Грамматика английского языка для студентов биологического факультета = English Grammar for Biology Students. В 2 ч. Ч. 2.** Дапаможнік накіраваны на ўдасканальванне навыкаў перакладу і паглыблення ведаў па граматыцы англійскай мовы. Уключаны кароткі граматычны матэрыял і комплекс практыкаванняў, якія грунтуюцца на агульнанавуковай, спецыяльнай і размоўнай лексіцы.

**Мир грамматики = The World of Grammar.** Мэта дапаможніка –




навучыць студэнтаў перакладаць спецыяльныя тэксты, якія ўтрымліваюць матэматычную лексіку, а таксама ўдасканальваць навыкі вуснага і пісьмовага англійскага маўлення на аснове бытавой лексікі.

**Изучаем биологию на английском языке = Biology for the students of masters courses.** Дапаможнік адрасаваны магістрантам біялагічнага факультэта і накіраваны на развіццё і замацаванне навыкаў практычнага валодання спецыялізаванай лексікай на англійскай мове.

**Мир информационных технологий = The World of Information Technology.** У дапаможніку асвятляюцца асноўныя тэмы па інфармацыйных тэхналогіях. Уключаны аўтэнтычныя тэксты, лексічна арыентаваныя практыкаванні для развіцця навыкаў чытання і вуснага маўлення, а таксама заданні для дыскусій.

**Улучшаем навыки перевода = Practise your Skills.** У дапаможніку разглядаюцца граматычныя і лексічныя цяжкасці перакладу і рэферыравання спецыяльных тэкстаў, якія ўтрымліваюць лексіку, найбольш ужывальную ў сферы інфармацыйных тэхналогій і Інтэрнэту.

**Английский язык для аспирантов: Статья в научном журнале. Психология, социология, информация и коммуникация = English for Post-graduates: Article in a Scientific Journal. Psychology, Sociology, Information and Communication.** Мэта дапаможні-




ка – даць аспірантам і маладым навукоўцам уяўленне аб пісьмовых акадэмічных зносінах на прыкладзе так званых малых тэкстаў (артыкулаў), навучыць дэкадзіраваць і кадзіраваць навуковыя профільныя тэксты з улікам спецыфікі іх мовы, структуры, камунікатыўных стратэгій, у тым ліку і стратэгій графічнага афармлення тэкстаў.

*Дублянский В.И.* **Практикум по грамматике испанского языка. В. 2 ч. Ч. 2. Сослагательное, повелительное и условное наклонения.** Мэта дапаможніка – фарміраванне і развіццё ў студэнтаў навыкаў граматычна правільнага іспанскага маўлення. Разгледжаны ўсе часавыя формы абвеснага ладу дзеясловаў.

**Испанский язык: сборник аутентичных текстов для студентов естественнонаучных факультетов = Lengua Española: Textos auténticos para los estudiantes de ciencias naturales.** Мэта дапаможніка –




развіццё навыкаў перакладу арыгінальнага тэксту і пашырэнне вузкаспецыяльных ведаў студэнтаў. Лексіка тэкстаў мае агульнанавуковы і спецыяльна-тэрміналагічны характар.

*Шалапёнок Е.С.* **Краткий определитель водных беспозвоночных животных.** У вучэбным дапаможніку прыводзяцца характарыстыкі розных груп водных беспазваночных, метады збору і апрацоўкі сабранага матэрыялу, вызначальныя табліцы і апісанне найбольш распаўсюджаных прадстаўнікоў асноўных тыпаў і класаў, іх значэнне.

*Ортега-и-Гассет Х.* **Миссия университета.** Даследаванне знакамі-




тага іспанскага філосафа і культуролага прысвечана вывучэнню універсітэцкай адукацыі як спецыфічнай культурнай і сацыяльнай практыкі.

*Довнар Н.Н.* **Правовые основы журналистики.** У вучэбна-метадыч-




ным комплексе паслядоўна выкладаюцца асноўныя аспекты прававога рэгулявання сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

*Матейко О.М.* **Высшая математика. Примеры и задачи.** У дапаможніку разглядаюцца матэматычныя задачы з геаграфічным зместам. Прыведзены прыклады з фізічнай і эканамічнай геаграфіі.

*Гринев В.В.* **Генетика человека.** У курсе лекцый выкладаюцца асновы генетыкі чалавека.

*Рамза Т.Р.* **Сінтаксіс: Тэарэтычны курс.** Кніга змяшчае тэарэтыч-




ныя звесткі аб найбольш праблемных пытаннях сінтаксічнай навукі, а таксама матэрыял па новай праграмнай тэме "Тэкст", узоры моўнага аналізу і мікратэксты для самастойнай працы.

**Повреждения позвоночника и грудной клетки.** У метадычных рэкамендацыях прыводзяцца звесткі па распазнаванні асноўных відаў механічных пашкоджанняў пазваночніка і грудной клеткі і аказанні неадкладнай дапамогі на месцы здарэння.

**Дидактика высшей школы.** У зборніку прадстаўлены рэфераты артыкулаў замежных даследчыкаў у вобласці дыдактыкі вышэйшай школы.

*Ерёмова Н.Г.* **Экология человека.** У курсе лекцый разглядаюцца




пытанні ўзаемадзеяння чалавека з акаляючым асяроддзем ва ўмовах сучаснага прамыслова развітога грамадства і праблемы захавання і развіцця здароўя чалавека.

*Лобко А. С.* **Экспериментальные исследования параметрического рентгеновского излучения.** У манаграфіі апісаны сучасныя даследаванні параметрычнага рэнтгенаўскага выпраменьвання, якое ўзнікае пры праходжанні зараджаных часціц праз крышталічныя мішэні.

**Русский язык как иностранный.** Праграма прызначана для замежных слухачоў падрыхтоўчых факультэтаў і аддзяленняў ВНУ Рэспублікі Беларусь. Змяшчае патрабаванні да валодання рускай мовай як замежнай у сістэме камунікатыўна-маўленчай кампетэнцыі.

*Янушкевич И.И.* **Конфессиональная политика советского государства: уроки истории (1917–1928 гг.).** Манаграфія прысвечана аналізу асноўных аспектаў палітыкі савецкай дзяржавы ў адносінах да рэлігійных арганізацый на тэрыторыі Беларусі ў перыяд 1917–1928 гг.

*Махонь С.В.* **Современный русский язык: тематический контроль. Фонетика. Лексическая семантика. Лексикология. Фразеология.** У дапаможніку змешчаны пытанні і заданні для прамежкавага кантролю па тэмах, прадугледжаных вучэбным планам.

*Прохоров А.А.* **Князь Тур: история легенды. Сакрализация княжеской власти у славян.** У мана-




графіі даследуецца вобраз легендарнага князя Тура. Праводзіцца супастаўленне даных археалагічных раскопак з матэрыяламі міфаў, легенд і гістарычных апісанняў грэчаскіх і рымскіх аўтараў. Аналізуюцца лінгвістычны, археалагічны і наратыўны аспекты старажытнай гісторыі ў кантэксце станаўлення беларускай дзяржаўнасці.

**Праграмы агульных курсаў.** Выданне змяшчае базавыя эксперыментальныя праграмы агульных курсаў для студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якія навучаюцца па спецыяльнасці "Гісторыя".

**Изучаем в магистратуре химию на английском языке = Chemistry for Students of Master Courses.** Дапаможнік накіраваны на развіццё і замацаванне навыкаў валодання спецыялізаванай лексікай на англійскай мове і вуснага маўлення на базе аўтэнтычных тэкстаў па спецыяльнасці.

**Практыкум па стылістыцы беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 2. Марфалагічная і сінтаксічная стылістыка.** У выданні змешчаны комплекс практыкаванняў па стылістычнай марфалогіі і сінтаксісе.

**Вопросы физического воспитания студентов вузов. Вып. 5.** У




зборніку прадстаўлены навуковыя і метадычныя артыкулы па праблемах фізічнага выхавання і спорту студэнцкай моладзі.

**Гісторыя літаратурнай крытыкі.** Праграма скіравана на вывучэнне і аналіз асноўных перыядаў у фарміраванні крытычнай думкі і метадалогіі крытыкі на Беларусі, узаемасувязяў грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне і ўзроўню аб'ектыўнасці ацэнак літаратурных твораў, прынцыпаў эстэтыка-аналітычнага падыходу да літаратурнай творчасці.

*Дунай В.И.* **Становление терморегуляции в онтогенезе: участие монооксида азота.** У манаграфіі абагульнены звесткі аб станаўленні тэрмарэгуляцыі ў антагенезе гамаятэрмных жывёл і ўцягненні ў гэты працэс монааксіду азоту. Асноўная ўвага нададзена вывучэнню зменаў у размеркаванні нейронаў гіпаталамусу, якія змяшчаюць сінтазу NO, у раннім постнатальным антагенезе птушак.

*Усовская Э.А.* **Парадигма постмодернизма в культуре XX века.**




У манаграфіі зроблена спроба навуковага асэнсавання постмадэрнізму як аднаго з напрамкаў культурфіласофскай думкі.

**Грамматические трудности на уровне Upper-Intermediate – Advanced.** У дапаможніку разглядаюцца артыклі, неасабовыя формы дзеяслова, сродкі сувязі і іншыя граматычныя формы англійскай мовы.

**Аутентичные тексты для чтения по радиофизике и электронике = Authentic Reading on Radiophysics and Electronics.** Дапаможнік змяшчае матэрыялы для чытання і абмеркавання, падабраныя з арыгінальных крыніц і часопісаў "Physics Review".

**Радиационные поражения.** У вучэбным дапаможніку разглядаюцца механізмы ўздзеяння на чалавека іанізуючых выпраменьванняў, працэсы фарміравання прамянёвага пашкоджання, даюцца рэкамендацыі па радыяцыйнай бяспецы.

**Учимся правильно говорить = Develop Your Listening and Speaking Skills.** Вучэбна-метадычны дапаможнік накіраваны на развіццё навыкаў аўдыявання і маўлення на англійскай мове.

*Лесникович А.И.* **Избранные главы неорганической химии. Атом. Молекула. Вещество.** У ву-




чэбным дапаможніку падаюцца звесткі абагульненага характару па найважнейшых раздзелах курса "Тэарэтычныя асновы неарганічнай хіміі".

**Эмоционально-волевая саморегуляция.** У дапаможніку дадзены тэарэтычны матэрыял, псіхалагічныя тэсты, практыкаванні і комплексы па прыёмах самавыхавання валявых якасцяў, эмацыянальнай самарэгуляцыі.

**Введение в математический анализ.** У дапаможніку прыведзены неабходныя тэарэтычныя звесткі для паўтору і самастойнага вывучэння элементаў тэорыі мностваў, базавых паняццяў тэорыі сапраўдных лікаў, метаду матэматычнай індукцыі і элементаў камбінаторыкі, якія выкарыстоўваюцца пры выкладанні курса матэматычнага аналізу; тэорыя сапраўдных лікаў; лікавыя паслядоўнасці і шэрагі; мяжа і безупыннасць функцый адной пераменнай.

*Ляхович-Петракова Н.В.* **Теория и практика оценки публичной политики.** У праграме раскрываецца тэматычны змест лекцыйных заняткаў курса, даюцца практычныя заданні для падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў, а таксама рэкамендацыі па іх выкананні.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

МАЙСТРОЎНЯ

# ЭКАЛОГІЯ ПА ШВЕДСКІМ УЗОРЫ

***Беларускі дзяржаўны універсітэт актыўна супрацоўнічае з многімі замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі з іншых краін. Адным з найбольш цікавых сумесных адукацыйных праектаў з'яўляецца праграма "Балтыйскі універсітэт", якая паспяхова рэалізуецца на факультэце міжнародных адносін і хімічным факультэце БДУ.***

На ФМА гэта праграма існуе ўжо другі год, і на днях 13 яго студэнтаў атрымалі сертыфікаты аб паспяховай здачы экзамену па спецкурсе "Рэгіён Балтыйскага мора: культура, палітыка, грамадства". Для іх калег на хімічным факультэце ўсё толькі пачынаецца. З сакавіка 2007 г. група з дзевяці юнакоў і дзяўчат розных курсаў пад кіраўніцтвам дацэнта Таццяны Савіцкай пачала ажыццяўляць падрыхтоўку па адпаведнай праграме.

### Ля вытокаў "Балтыйскага універсітэта"

Праграма "Балтыйскі універсітэт" ахоплівае 190 ВНУ з 14-ці краін рэгіёна Балтыйскага мора, у тым ліку многія навуковыя ўстановы Беларусі, Украіны, Славакіі і Чэхіі. З 1991 г. яе каардынацыяй займаецца Упсальскі універсітэт (Швецыя). Акрамя таго, прадугледжаны мясцовыя цэнтры для распаўсюджвання і атрымання інфармацыі. У нашай краіне такі цэнтр знаходзіцца ў БНТУ. Пры яго пасрэдніцтве ФМА БДУ і далучыўся да праграмы "Балтыйскі універсітэт". Яе мэта – аб'яднанне універсітэтаў рэгіёна Балтыйскага мора для супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, сацыяльнага і экалагічнага развіцця. Нягледзячы на геаграфічныя, палітычныя і культурныя адрозненні, ва ўзгаданых краінах існуюць агульныя праблемы, вырашэнне якіх немагчыма без сумесных намаганняў навуковых устаноў.

Праграма "Балтыйскі універсітэт" разлічана на студэнтаў, магістрантаў і выкладчыкаў. "Народы Балтыкі", "Устойлівае развіццё Балтыйскага рэгіёну", "Балтыйскі рэгіён: культура, палітыка, грамадства", "Устойлівы водны менеджмент" – гэта няпоўны спіс вучэбных курсаў, прапанаваных удзельнікам праграмы. Па кожным маюцца спецыяльныя падручнікі і відэаматэрыялы, якія былі распрацаваныя ў Швецыі.

### БДУ: перайманне вопыту

Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Балтыйскім універсітэтам было падпісана Віктарам Самахвалам, прарэктарам Белдзяржуніверсітэта па вучэбнай рабоце, і намеснікам дырэктара праграмы "Балтыйскі універсітэт" Крыстынай Якабсан на міжнароднай канферэнцыі кіраўнікоў ВНУ, якая праходзіла ў шведскім Упсала ў кастрычніку 2006 г.

Намеснік дэкана хімічнага факультэта па навуковай рабоце Таццяна Савіцкая адразу ж зацікавілася праграмай і сфарміравала групу студэнтаў, якія пажадалі стаць яе ўдзельнікамі. Выбар вучэбнага курса "Навакольнае асяроддзе Балтыйскага мора" невыпадковы, бо ён непасрэдна звязаны з хіміяй, напрыклад, з такім яе аспектам, як хімічныя палютанты (забруджвальнікі). Да таго ж, многія праблемы, якія акрэслены ў вучэбных дапаможніках гэтага курса, актуальныя для нашай краіны. Студэнты атрымоўваюць значныя веды па сумежных з хіміяй дысцыплінах: фізіцы, геаграфіі, гісторыі, што пашырае кругагляд маладых людзей і выводзіць іх за рамкі вузкай спецыялізацыі. Згаданы курс разлічаны на 10 заняткаў. Да кожнага з іх студэнты загадзя размяркоўваюць матэрыял, грунтоўна рыхтуюцца дома, а потым паведамляюць аднагрупнікам самае цікавае і важнае. Затым адбываецца дыскусія і прагляд навуковых фільмаў. Пасля вывучэння тэмы пішуцца праверачныя тэсты. Акрамя таго, калі-нікалі на занятках запрашаюцца спецыялісты нашага універсітэта, якія займаюцца праблемамі навакольнага асяроддзя і могуць распавесці пра апошнія дасягненні айчыннай навукі. Маладыя людзі вывучаюць праграму курса на англійскай мове – і гэта іх свядомы выбар, бо адначасова яны атрымліваюць практыку вуснага маўлення на замежнай мове, вучацца абгрунтоўваць сваю думку, весці навуковую спрэчку. Таццяна Савіцкая адзначае, што нават высокі ўзровень вучэбных матэрыялаў зусім не пужае іх невялікую каманду – усе спраўляюцца выдатна.



*Студэнты хімічнага факультэта разам са сваім куратарам Таццянай Савіцкай (у цэнтры) на занятках па праграме "Балтыйскі універсітэт"*

### Перспектывы

Пасля заканчэння курса студэнты будуць здаваць экзамен праз Інтэрнэт. Калі маладыя людзі справяцца з гэтым выпрабаваннем, то яны атрымаюць дыпломы міжнароднага ўзору, якія пры паступленні ў ВНУ Заходняй Еўропы даюць пэўную колькасць "крэдытаў", або дадатковых балаў. Гэта адбудзецца ў верасні–кастрычніку 2007 г. – пасля таго, як хваляванні летняй сесіі застануцца ў мінулым. Але, канешне, атрыманне дыплому – не адзіная мэта ўдзельнікаў праекта. Іх прываблівaюць і іншыя аспекты праграмы.

– Я зацікавіўся гэтай праграмай, таму што мая будучая спецыяльнасць непасрэдна звязана з экалогіяй. Акрамя таго, гэта цудоўная магчымасць атрымаць моўную практыку, накапіць тэрміналагічную базу на англійскай мове. Мяркую, гэта можа спатрэбіцца для ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях. Праграма "Балтыйскі універсітэт" яднае студэнтаў хімічнага факультэта, дапамагае наладзіць дыялог паміж курсамі, – выказаў агульную думку Віктар Брундукоў, студэнт II курса.

Не паспеўшы скончыць вывучэнне першага для іх курса праграмы, заўзятыя студэнты ўжо плануюць новы. На думку куратара, гэта, хутчэй за ўсё, будзе "Устойлівы водны менеджмент". Дарэчы, на канферэнцыі выкладчыкаў праграмы "Балтыйскі універсітэт", якая адбылася ў пачатку лютага ў Польшчы, Таццяна Савіцкая выступіла з прапановай распрацаваць у дадатак да тэарэтычных курсаў таксама лабараторныя работы, падчас якіх студэнт зможа праверыць атрыманыя веды. Для прыкладу яна прадэманстравала хімічны вопыт па ачыстцы бруднай вады актываваным вуглём і новымі матэрыяламі-фільтрамі. Гэты спосаб быў распрацаваны спецыялістамі БДУ. Насамрэч ён просты і цікавы, але пакуль што яго апісання няма ні ў водным падручніку. Студэнты ажыццяўляюць дадзены эксперымент на занятках "Калоідная хімія". Усё гэта вельмі зацікавіла замежных калег.

Ідэй у Таццяны Савіцкай і яе выхаванцаў сапраўды шмат. У планах паездка ў Швецыю і абмен досведам са студэнтамі Тэхнічнага універсітэта Лодзі (Польшча). І гэта толькі першыя крокі, а колькі цікавага яшчэ наперадзе...

Займацца па праграме "Балтыйскі універсітэт" могуць студэнты ўсіх факультэтаў. Знайшоўся б толькі ініцыятыўны выкладчык, які возьмецца за гэту карысную, але ж і адказную справу.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

**Фота аўтара**

КАНФЕРЭНЦЫІ

# У ГОНАР ВЫБІТНАГА МАТЭМАТЫКА

***Навукоўцы і спецыялісты ў вобласці дыферэнцыяльных ураўненняў з Беларусі, Расіі, Малдовы і Славеніі сталі ўдзельнікамі міжнароднай навуковай канферэнцыі "Яругінскія чытанні–XII", прысвечанай 100-годдзю заслужанага дзеяча навукі БССР, акадэміка Мікалая Яругіна.***

Форум прайшоў на базе дома адпачынку "Іслач" НАН Беларусі, размешчаным у 35-ці км ад Мінску. Яго арганізатарамі выступілі Беларускі дзяржаўны універсітэт і Інстытут матэматыкі НАН Беларусі. 17 мая "Яругінскія чытанні" адкрылі рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і дырэктар інстытута Іван Гайшун. На пленарным пасяджэнні прагучалі ўспаміны пра выбітнага навукоўца і даклад аб унёску Мікалая Яругіна ў развіццё тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў у Беларусі.

### Даведка

Мікалай Паўлавіч Яругін (1907–1990) нарадзіўся 14 мая ў Растоўскай губерні. У 1932 г. закончыў фізіка-матэматычны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. У 1943 г. абараніў доктарскую дысертацыю па тэорыі прыводных сістэм. З 1949 па 1950 гг. займаў пасаду дэкана матэматычнага факультэта ЛДУ, а пасля ўзначаліў Інстытут матэматыкі імя Сцяклова АН СССР. У 1951 г. яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР, а ў 1956 г. М.П. Яругін выбіраецца акадэмікам АН БССР і пераязджае ў Мінск. Мікалай Паўлавіч з'яўляўся арганізатарам і першым дырэктарам Інстытута матэматыкі АН БССР, з 1977 па 1982 гг. – членам Прэзідыума Акадэміі навук БССР, на працягу шэрагу гадоў узначальваў кафедру дыферэнцыяльных ураўненняў Белдзяржуніверсітэта. У 1965 г. стварыў і пачаў выдаваць у Мінску ўсесаюзны часопіс "Дыферэнцыяльныя ўраўненні", галоўным рэдактарам якога заставаўся да сярэдзіны 1989 г.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

***У Белдзяржуніверсітэце 17 мая прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя "Авангард і культура: мастацтва, дызайн, наваколле", прымеркаваная да Сусветнага дня культурнай разнастайнасці дзеля дыялога і развіцця.***

# АВАНГАРД ЯК СРОДАК КУЛЬТУРНАГА ДЫЯЛОГА

У ёй прынялі ўдзел каля 40 навукоўцаў і экспертаў у галіне мастацтвазнаўства, архітэктуры, дызайну, інжынерных навук з вядучых ВНУ, мастацтвазнаўчых арганізацый і музеяў Беларусі, Арменіі, Азербайджана, Англіі, Шатландыі, Францыі, ФРГ, Польшчы, Ізраіля, Літвы, Італіі.

На пленарных пасяджэннях абмяркоўваліся пытанні, прысвечаныя феномену авангарду, разнастайнасці формаў культурнага самавыяўлення, авангардным тэндэнцыям у нацыянальным дызайне і віртуальнай прасторы. Канферэнцыя арганізавана кафедрай мастацтваў і Цэнтрам візуальных мастацтваў і медыя ДзІКіСТа БДУ пры ўдзеле Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЭСКА, Дзяржаўнага цэнтра сучаснага мастацтва Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі, пасольстваў Францыі, ФРГ, Вялікабрытаніі, Італіі, Польшчы ў Беларусі, Польскага інстытута і Сусветнай арганізацыі адукацыйных рэсурсаў і тэхналагічнага трэнінгу. Падтрымку ў арганізацыі форуму аказала Бюро ЮНЭСКА ў Маскве.

У дзень закрыцця канферэнцыі, 19 мая, адбыліся аўтарскія артпрэзентацыі і дыскусіі, а таксама была прадстаўлена мемарыяльная экспазіцыя "Прастора Хаіма Суціна".

**Аляксандра ЛІСТАПАД**

## З УСМЕШКАЙ

Студэнт вяртаецца з першага экзамену, бацькі кідаюцца да яго:

– Ну як?

– Нічога, толькі экзаменатар нейкі рэлігіёзны фанатык: кожны раз, калі я нешта гаварыў, ён падымаў вочы да столі і ўсклікаў "Божа мой!"

***

– Ці ёсць пытанні, якія вас бянтэжаць? – запытаўся прафесар на экзамене.

– Няма ніводнага, – адказаў студэнт. – Але затое мяне непакояць адказы на іх.

***

– Калі дэкан не возьме назад словы, якія ён сказаў мне сёння раніцай, я буду вымушаны пайсці з каледжа.

– Што ж ён такое сказаў?

– Ён сказаў мне, каб я пакінуў каледж.

***

Прафесар:

– Дурань можа задаць больш пытанняў, чым мудры чалавек адказаць.

Студэнт:

– Не дзіўна, што многія з нас правальваюцца.

ВЫСТАВЫ

# ЦЁПЛЫ ДОМ – БДУ

***Выстава "Свет творчасці. Свет захапленняў" прайшла 15–27 мая ў будынку рэктарата. Яна была арганізаваная Саюзам жанчын БДУ і прымеркаваная да Дня сям'і.***



*Старшыня Саюза жанчын БДУ Святлана Савіцкая адорвае ўдзельнікаў выставы*

У цырымоніі адкрыцця браў удзел рэктар прафесар Васіль Стражаў. На выставе дэманстраваліся карціны, малюнкі, розныя вырабы, упрыгажэнні і іншыя экспанаты, выкананыя студэнтамі, супрацоўнікамі БДУ і іх дзецьмі. Работы аб'яднаны агульнай тэмай "Мой цёплы дом", дзе пад словам "дом" разумеецца alma-mater. Акрамя таго, тут выстаўляліся аўтарскія калекцыі ўпрыгажэнняў са скуры і напаўкаштоўных камянёў беларускіх мастачак Наталлі Бортнік і Таццяны Смірновай.

Экспазіцыя настолькі спадабалася наведвальнікам, што па іх просьбе была працягнутая яшчэ на два дні і ператварылася ў сапраўднае свята творчасці. Напрыканцы ўсе ўдзельнікі атрымалі маляўнічыя дыпломы, а таксама "фірмавыя" падарункі.

**Глеб РАДОМСКІ**

**Фота Аляксандра СНАПКА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года
4 чэрвеня 2007 года
Падпісана да друку 1.06.2007 г.
Зак. 555. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праcп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by